

УСЕ МЫ ТРОХІ «ШАФЁРЫ»

8

«ВАЙНА ПАД СТРЭХАМІ» І БЕЗ...

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ВЕРАСНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 186 (30066)

## КОРАТКА

- **«Хопіць на ўсіх». У Мінлясгасе расказалі аб забеспячэнні насельніцтва дровамі да ацяпляльнага сезона.**
- БРСМ і маладзёжная арганізацыя Казахстана «Жастар Рухы» падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве.
- **Беларусь і Кітай абмеркавалі перспектывы развіцця біржавога гандлю.**
- «Вялікі камень» прадставіў свой патэнцыял дзелавым колам Санкт-Пецярбурга.
- **Парламент Расіі завяршыў ратыфікацыю пратакола аб змяненнях умоў крэдытавання будаўніцтва БелАЭС.**
- «Гомсельмаш» паставіць у Казахстан абноўленыя збожжаўборачныя камбайны.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй МАЦКЕВІЧ, начальнік упраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі:**

*«Згодна з пастановай Савета Міністраў нумар 392 па падрыхтоўцы да асенне-зімовага перыяду, да 1 кастрычніка на складах Мінлясгаса павінны быць сфарміраваны запасы драўнянага паліва ў аб'ёме 632 тыс. куб. м. Гэтыя аб'ёмы створаны. У цэлым па краіне засталося каля 2 млн куб. м дрывяной драўніны, таму з рэалізацыяй насельніцтву гэтай прадукцыі праблем няма. Гэтага аб'ёму хопіць на ўсіх. Цяпер мы таксама актыўна займаемся ўстаноўкай абсталявання для рэалізацыі колатых дроў на месцы. У 78 лясгасах яно ўжо ёсць».*

З першых вуснаў

# «МЫ РОБІМ У МІРНЫ ЧАС ТОЕ, ШТО ЗАЎСЁДЫ ЎМЕЛІ І ЎМЕЕМ РАБІЦЬ»

### Прэзідэнт паставіў задачы і даў парады новым кіраўнікам раёнаў

**У новы працоўны тыдзень — з новай пасадай. З панядзелка да новай працы прыступілі кіраўнікі шэрагу мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, кіраўнікі найважнейшых арганізацый — Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні.**

Юрый Горлаў, які займаў пасаду старшыні Маладзечанскага райвыканкама, прызначаны памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Гомельскай вобласці. Першае пытанне ад кіраўніка дзяржавы: якая цяпер сітуацыя ў Маладзечне? Юрый Горлаў далажыў, што сітуацыя ў Маладзечне і Маладзечанскім раёне стабільная, выконваюцца ўсе асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, грамадска-палітычная абстаноўка спакойная. Але найбольш Прэзідэнта цікавіла, якое самае праблемнае прадпрыемства цяпер у Маладзечне. Па словах Юрыя Горлава, на сёння адно з самых праблемных прадпрыемстваў — завод металаканструкцый.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# Родныя ягады, родныя птушкі




У мінулыя выхадныя ў Мёрах прайшло традыцыйнае свята, якое стала візітоўкай раёна, — «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю». Час для экалагічнага свята, якое праводзіцца ўжо больш за дзесяць гадоў, выбраны невыпадкова — на мясцовых балотах, дзе якраз выспявае багаты ўраджай журавін, перад адлётам збіраюцца чароды чырванакніжных шэрых жураўлёў, паглядзець на якія збіраюцца аматары птушак нават з замежжа.

Алег і Ірына ДЗЯДЗЮРЫ шэсць гадоў назад пераехалі ў Мёры, родны горад Алега, са сталіцы. Яны з дзецьмі — трэцякласнікам Арцёмам і трохгадовай Дарынай — прыйшлі на фестываль не з пустымі рукамі: сёлета сабралі больш за 70 кілаграмаў журавін.

**Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.**

Новы вопыт

# СТАЎКА НА СЛАНЕЧНІК

### Ці прыжывецца паўднёвая культура на беларускіх палетках?

**Яшчэ нядаўна поле сланечніку здавалася нам дзіўнай з'явай. Апошнім часам кола айчынных прыхільнікаў гэтай культуры пашыраецца. Сельгасвытворцы паспелі ацаніць якасць каштоўнага кармавога бялку, які ў пэўнай ступені становіцца імпартазамяшчальным. Менавіта такую стратэгію выбралі ў СВК «Гродзенскі», дзе алейная культура вырошчваецца ўжо чатыры гады. А сёлета тут набылі спецыяльную жняярку, якая, дарэчы, выдатна справілася з уборкай сонечнай культуры.**

Яшчэ некалькі дзён таму жняярка хадзіла па полі, а цяпер сланечнікавы ўраджай чорнай гарой высіцца на складзе СВК «Гродзенскі». Галоўны аграном Юрый Вялічка зачэрпвае жменю з гэтай гары, перасыпае яе ў руках. Асабіста мне даводзілася бачыць падобныя семкі толькі на рынках альбо ў крамах. Зразумела, што не ў такіх вялізных аб'ёмах.

— У нас тут 430 тон, — акрэслівае памеры сланечнікавай гары мой суразмоўнік. — Гэта ўвесь сёлетні ўраджай. Атрымалі з гектара 43 цэнтнеры. Такі вынік можна лічыць дастойным.

СТАР. 3



ISSN 1990 — 763X

23186

9 771990 763008

# «МЫ РОБІМ У МІРНЫ ЧАС ТОЕ, ШТО ЗАЎСЁДЫ ЎМЕЛІ І ЎМЕЕМ РАБІЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адказваючы на пытанне Аляксандра Лукашэнкі, ён адзначыў, што прадпрыемства не мае неабходнай загрузкі і да вырашэння гэтай праблемы падключаліся ўжо на розных узроўнях, шэраг даручэнняў дадзены ў тым ліку прэм'ер-міністрам. «Мы ўносілі прапановы аб тым, каб задзейнічаць гэтае прадпрыемства ў прамысловасці нашай краіны, каб сёння мы працавалі на галіну аграпрамысловасці», — сказаў Юрый Горлаў. Па яго словах, завод шукае заказы і за мяжой, цяпер ідзе работа над развіццём супрацоўніцтва з расійскімі калегамі. На прадпрыемстве робяць кантэйнеры не толькі для чыгуначных, але і для марскіх перавозак. Ужо наладжаны сувязі з Ленінградскай вобласцю і Санкт-Пецярбургам. «Значыць, працуючы на новай пасадзе, вазьміце гэтыя пытанні на кантроль, — даручыў Прэзідэнт. — Пройдзе гэты год, наступны пачнецца, папярэдзьце ўрад, што ў вас гэта на кантролі, і мне далажыце. Тое, што рабілі ў Маладзечне і што могуць рабіць па металаканструкцыях, ні адно прадпрыемства ў краіне рабіць не можа, гэта моцнае прадпрыемства. І паглядзіце, каб яно працавала на ўсю краіну», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

## «Усё ў вашых руках»

Старшыня Віцебскага райвыканкама Генадзь Сабыніч пераходзіць на пасаду старшыні Віцебскага гарвыканкама. Першы намеснік старшыні Наваполацкага гарвыканкама Сяргей Сямёнычаў узгоднены на пасаду старшыні Мёрскага райвыканкама. Дырэктар ААТ «Маяк Высокае» Аршанскага раёна Алег Макарэвіч цяпер старшыня Сенненскага райвыканкама. Кандыдатура Уладзіміра Бялова, старшыні Ганцавіцкага райвыканкама, узгоднена на пасаду старшыні Івацэвіцкага райвыканкама. Ганцавіцкі раён узначаліць Віктар Рафаловіч, старшыня Лунінецкага раённага Савета дэпутатаў. Кандыдатура Дзмітрыя Шынкарэнкі, старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама, узгоднена на пасаду старшыні Кармянскага райвыканкама. Дырэктар ААТ «Наднёман» Дзмітрый Чыгір узначаліў Дрыбінскі райвыканкам.

Звяртаючыся да новых старшынь райвыканкамаў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што свае задачы яны ведаюць. З некаторымі сустракаліся некалькі дзён таму на семінары-нарадзе па пытаннях развіцця жывёлагадоўлі, што прайшоў у Салігорску. «Тыя задачы, якія пастаўлены ў галіне жывёлагадоўлі, вам зразумелыя і вядомыя, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Адзінае, папрашу вас, не «ўваходзьце ў становішча». Вы ведаеце, асабліва тыя, хто працаваў у аграрным сектары, што такое «ўваходзіць у становішча». Да вас зараз будуць прыходзіць і расказваць, што тое ці іншае немагчыма. Але як я часта кажу: мы ж не на вайне. Мы робім у мірны час тое, што заўсёды ўмелі і ўмеем рабіць. Прымусьце сваіх падначаленых гэта зрабіць... Віцебская і Гомельская вобласць, Магілёўшчына — жалезны кантроль», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы, дадаўшы, што хапае праблем і ў Брэсцкай вобласці. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што рух па кадрах ідзе «па ўзгадненні бакоў». Па яго словах, гэта значыць, што былыя кіраўнікі не вельмі спраўляліся на гэтай пасадзе. «Яшчэ раз падкрэсліваю: кампартыі няма — усё ў вашых руках», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што наперадзе — вялікая электаральная кампанія. Па яго словах, у сувязі з гэтым ідэалагічны складнік мае першачарговае значэнне. «Працуйце, думайце, хто будзе прадстаўляць вас у парламенце, Усебеларускім народным сходзе. Мы абсалютна не хаваем тое, што кагосьці будзем падтрымліваць, гэта натуральна. Калі б мы сёння сябе такімі цнатлівымі і некранутымі прадстаўлялі, з нас бы проста смяяліся», — заўважыў Прэзідэнт, дадаўшы, што ўлады падтрымліваюць кагосьці ўсюды, нават у краінах, якія пазіцыянуюць сябе як самыя дэмакратычныя. «Таму ў нас ёсць свае задачы, свае мэты, вызначайце дастойных, патрыятычных людзей, прафесіяналаў і падтрымлівайце іх на парламенцкіх выбарах і на Усебеларускі народны сход», — падкрэсліў ён. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што на выбары павінны ісці прафесіяналы, дастойныя. «Каб людзі, даведаўшыся аб кандыдатах, якіх мы падтрымліваем, не кідалі нам у твар гадасці», — растлумачыў ён. А разумных, таленавітых у нас дастаткова.

***

Новыя кіраўнікі ў панядзелак з'явіліся і на важных для краіны прадпрыемствах. Першы намеснік генеральнага дырэктара — тэхнічны дырэктар «Амкадор-Агідэль» Алег Корсак з панядзелка — генеральны дырэктар ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Бабруйскаграмаш». Раман Трубіцкі, дырэктар ААТ «Лідскі ліцейна-механічны завод», узначаліў ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Лідсельмаш». Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў кандыдатуры новых кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і кіраўнікоў мясцовых выканаўчых органаў. Старшыня Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і абароны навакольнага асяроддзя Віктар Галанаў — новы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Старшыня камітэта эканомікі Мінскага гарвыканкама Уладзімір Навумовіч — новы намеснік міністра эканомікі. Старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Віцебскага аблвыканкама Аляксей Героеў пераходзіць на пасаду намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама, які курыруе пытанні будаўніцтва і ЖКГ. Кандыдатура старшыні Мёрскага райвыканкама Ігара Кузняцова ўзгоднена на пасаду кіраўніка спраў Віцебскага аблвыканкама.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

### У размове з журналістамі назначэнцы падзяліліся сваімі мэтамі на работу на новых пасадах і расказалі, якія задачы перад імі паставіў Прэзідэнт

**Новы памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ГОРЛАЎ** падкрэсліў, што ведае гэты рэгіён па сваім вопыце работы ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання. «Працы будзе вельмі шмат, я ўпэўнены, што з кадрамі Гомельшчыны мы знойдзем поўнае ўзаемаразуменне», — сказаў ён. Юрый Горлаў запэўніў, што ўсе даручэнні, дадзеныя Прэзідэнтам Гомельскаму рэгіёну, будуць выкананы. Па яго словах, краіна дала ўжо ўсё, каб выпрацоўваць дастаткова якаснай прадукцыі, таму сёння трэба мабілізавацца. Інспектар па Гомельскай вобласці падкрэсліў, што работа ўсіх органаў кіравання рэгіёна будзе нацэлена на фарміраванне надзейнага кадравага патэнцыялу. Ён падкрэсліў, што трэба будзе звярнуць пільную ўвагу на дысцыпліну і адказнасць на месцах. Галоўнымі якасцямі спецыялістаў у розных сферах Юрый Горлаў назваў прыстойнасць, адказнасць і дысцыплінаванасць. «Гэтых якасцяў дастаткова для таго, каб рэалізаваць тыя веды, якія чалавек атрымаў ва ўстанове адукацыі. Простыя элементарныя якасці — быць чалавекам і працаваць на карысць сваёй краіны», — адзначыў Юрый Горлаў.

**Уладзімір БЯЛОЎ, які цяпер узначальвае Івацэвіцкі райвыканкам,** добра ведае новы ўчастак работы. «Раён адначасова з'яўляецца прамысловым і сельскагаспадарчым, добра развіта дрэваапрацоўка, таму дробязяў у працы не павінна быць», — адзначыў ён. Кіраўнік райвыканкама асаблівую ўвагу плануе надаваць удасканаленню прадукцыі дрэваапрацоўкі і павелічэнню колькасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

**Алег КОРСАК, генеральны дырэктар ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Бабруйскаграмаш»,** расказаў, што перад прадпрыемствам стаяць задачы: паляпшэнне якасці прадукцыі, суадносіны якасці і сабекошту, зніжэнне імпартазалежнасці. «Да нядаўняга часу мы былі залежныя ад імпартных паставак камплектуючых. На сёння ёсць рух у імпартазамяшчэнні. Трэба ісці да поўнай лакалізацыі вытворчасці, займацца пошукам новых рынкаў збыту. Гэта галоўнае», — падкрэсліў Алег Корсак.

Ён таксама заўважыў, што трэба развіваць супрацоўніцтва з расійскімі партнёрамі і наладжваць сумесную вытворчасць. Сярод перспектыўных замежных партнёраў Алег Корсак назваў, у прыватнасці, Егіпет, якому для развіцця сельскай гаспадаркі неабходна высокатэхналагічная якасная тэхніка, якую выпускае «Бабруйскаграмаш».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Антырэйтынг Байдэна абнавіў максімум



Рэйтынг неўхваленьня прэзідэнта ЗША Джо Байдэна дасягнуў самай высокай адзнакі за ўвесь час яго знаходжання на пасадзе, сведчаць даныя апытання NBC News. Антырэйтынг амерыканскага лідара вырас да 56 працэнтаў. Паводле апытання, 53 працэнты рэспандэнтаў не ўхваляюць знешнюю палітыку Байдэна, а 59 працэнтаў — тое, як прэзідэнт вырашае эканамічныя пытанні. Разам з тым выбаршчыкі па-ранейшаму разглядаюць узрост Байдэна — яму 80 гадоў — як праблему: 74 працэнты рэспандэнтаў заявілі, што ў іх ёсць апасенні адносна таго, што ён мае неабходнае псіхічнае і фізічнае здароўе, каб паўнавартасна выконваць абавязкі прэзідэнта. У той жа час аб асноўным саперніку Байдэна — 77-гадовым экс-прэзідэнце Дональдзе Трампу — тое ж самае заявілі 44 працэнты апытаных. Як вядома, раней тэлеканал ABC News праводзіў сумеснае апытанне з газетай Washington Post, вынікі якога паказалі, што пры адміністрацыі Байдэна амаль палова амерыканцаў стала жыць горш.

### У Францыі звыш 30 тысяч чалавек узяло ўдзел у пратэстах супраць паліцэйскага гвалту

У гарадах Францыі прайшлі 116 масавых дэманстрацый супраць расізму і паліцэйскага гвалту, якія былі арганізаваныя ў асноўным левардыкальнымі арганізацыямі. Колькасць удзельнікаў пратэстаў склала 31 тысячу чалавек. Пра гэта паведаміла радыёстанцыя France Bleu са спасылкай на даныя МУС.

Сярод дэманстрантаў прысутнічалі прадстаўнікі як прафсаюзаў і студэнцкіх рухаў, так і палітычных партый. Як паведаміў прэфект сталічнай паліцыі Ларан Нуньес, трое паліцэйскіх пацярпелі на маніфестацыі ў Парыжы ў выніку нападу на машыну праваахоўнікаў. Побач з пратэстоўцамі ўтварылася калона з сотняў людзей у чорнай вопратцы з капюшонамі, якія закідалі камянямі паліцэйскія машыны і разгрямілі аддзяленне банка. Трое з тых, хто нападаў, затрыманы, праваахоўныя органы маюць намер прааналізаваць відэазапісы інцыдэнту для пошуку іншых правапарушальнікаў. Паводле звестак радыёстанцыі, у іншых рэгіёнах краіны дэманстрацыі прайшлі спакойна.

### Калумбійскія ваенныя канфіскавалі больш за тону какаіну ў Карыбскім моры

Ваенна-марскія сілы Калумбіі канфіскавалі больш за тону какаіну ў Карыбскім моры, паведаміла ТАСС са спасылкай на прэзідэнта краіны Густава Петра. Наркотыкі былі схаваныя на катары і дастаўляліся ў адну з краін Цэнтральнай Амерыкі. Праваахоўнікі канфіскавалі незаконны груз каля вострава Сан-Андрэс. У ходзе аперацыі былі затрыманыя пяць калумбійцаў. Усяго з пачатку года калумбійскія ваенныя канфіскавалі 265 тон какаіну. Паводле іх даных, незаконныя пасевы нарказмяшчальнай расліны ў краіне ўзраслі за год на 13 працэнтаў і дасягнулі плошчы 230 тысяч гектараў. Гэтыя лічбы сталі рэкорднымі для Калумбіі.

Адукацыя

## Чаму платнікі ідуць на размеркаванне

**Штогод каля тысячы выпускнікоў-платнікаў карыстаюцца магчымасцю размеркавацца. Аб гэтым паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі Сяргей Пішчоў, піша БелТА.**

«Каля тысячы платнікаў штогод карыстаюцца магчымасцю размеркавацца, таму што пры размеркаванні ў іх з'яўляецца статус маладога спецыяліста, які дае ім шэраг дадатковых магчымасцяў і прэферэнцый. Напрыклад, забаронена неабгрунтаваная адмова ў заключэнні працоўнага дагавора з маладым спецыялістам, які прыбыў на размеркаванне, гэта значыць, яго абавязаны ўзяць на працу. Пры прыёме на працу для маладога спецыяліста не прызначаецца выпрабавальны тэрмін. Пасля заканчэння навучання маладому спецыялісту даецца адпачынак працягласцю 31 дзень, для педагагічных кадраў — 45 дзён. Акрамя таго, выплачваецца грашовая дапамога ў памеры стыпендыі, прадугледжаны розныя кампенсацыі, ёсць дадатковая магчымасць стаць на чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў. Такія магчымасці даюцца маладым спецыялістам, і платнікі імі таксама карыстаюцца», — расказаў Сяргей Пішчоў.

Для выпускнікоў медыцынскіх спецыяльнасцяў, паводле слоў начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы і прафесійнай адукацыі Міністэрства аховы здароўя Вольгі Калюпанавай, існуе такая ніша, як інтэрнатура. «Без інтэрнатуры ў нас працаваць урачом-спецыялістам немагчыма, і не важна, на якой умове ты навучаўся — бюджэт або платная аснова. Выпускнік павінен яе прайсці. Для гэтага ён павінен знайсці базу інтэрнатуры. Калі не ўзяў размеркаванне, ён яе шукае самастойна і павінен звярнуцца ў Міністэрства аховы здароўя. Без інтэрнатуры ён працаваць у нашай краіне не зможа», — адзначыла яна.

# СТАЎКА НА СЛАНЕЧНІК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Гаспадарка — адна з нямногіх у Гродзенскім раёне, дзе заняліся вырошчваннем нязвыклай для нашых мясцін культуры. Спачатку паспрабавалі сеяць сланечнік разам з кукурузай для атрымання сіласу — зялёнага корму для жывёлагадоўчага статка. А два гады таму пад сонечную культуру адвялі асобны ўчастак у сто гектараў. Так атрымалася, што якраз каля дарогі. Неяк даводзілася праязджаць міма падчас цвіцення. Прыгожае відовішча! Не дзіўна, што многія спыняліся, каб зрабіць фотаздымкі каля жоўтых сонейкаў, а потым вылажыць іх у сваіх акаўнтах. Такое поле сапраўды спрыяе ўзнёсламу і радаснаму настрою...

У галоўнага агранома падыход да сланечніку больш празаічны.

— Мы вырошчваем не для эстэтыкі, галоўнае — эканоміка, наколькі гэта выгадная культура для развіцця гаспадаркі. У згаданым аспекце асноўная наша задача — забяспечыць жывёлагадоўчую галіну якаснымі кармамі. Яны павінны быць правільна збалансаванымі. Напрыклад, вугляводы мы атрымліваем з кукурузы, якую навучыліся вырошчваць. Але для кармавой базы вельмі важны бялок, без якога не будзе высокіх надояў. Даводзіцца купляць соевы шрот, ён завазны і дарагі. Каб знізіць сабекошт малака, неабходна замяніць соевы бялок іншым, альтэрнатыва — кармавыя бабы, рапсавы і сланечнікавы шрот, — тлумачыць Юрый Вялічка.

Менавіта на гэтыя мэты і пойдзе ўся тая гара сланечніку, што знаходзіцца на збожжаскладзе. Сельгаспрадпрыемства мае ўласную лінію па адцісканні насення. У сярэднім атрымліваецца да 80 тон алею, які гаспадарка паспяхова рэалізоўвае. Макуха ідзе на корм буйнарагатаму статку, што ў якасці бялковай дабаўкі спрыяе высокім надоям.

І хоць сланечнік — больш звыклая культура ў паўднёвых шыротах, яна ўсё шырэй заваёўвае заходнія рэгіёны. Пры гэтым не патрабуе высокапрадукцыйнай глебы. Трэба сказаць, што землярobам самай заходняй зоны Гродзенскага рэгіёна не вельмі пашанцавала. Палеткі тут — то пагорак, то нізіна. Вырошчваць ураджай у такіх умовах няпроста, бо вільготнасць не ўсюды аднолькавая. Калі, напрыклад, азімы рапс трэба сеяць на высокаўрадлівых глебах, то для сланечніку падыдуць і лёгкія пясчаныя ўчасткі.

— Сланечнік — культура цеплалюбівая, больш звыклая для паўднёвых рэгіёнаў. Але мы бачым, што клімат мяняецца, засуха мяжуецца з лівнямі, а сланечнік можа прыстасавацца да гэтых умоў з-за сваёй магутнай каранёвай сістэмы, яна можа выцягваць ваду. Таму яго можна сеяць на землях, якія лічацца нізкімі па прадукцыйнасці. Напрыклад, на палетках з пагорыстым рэльефам. Трэба вырошчваць такія расліны, якія могуць супрацьстаяць засусе, — упэўнены галоўны аграном.

Ёсць у вырошчванні сланечніку і свае асаблівасці. Сеюць увесну, калі тэмпература паветра не меншая за 8-9 градусаў, пасля таго як расліны ўзышлі, вядзецца падкормка азотнымі ўгнаеннямі. Для сланечніку важна, каб падчас цвіцення не было засухі, бо губляецца маса насення, а значыць, і ўраджай будзе меншы. Адзін з плюсоў — адсутнасць шкоднікаў. А вось ад гнілаты кошыкаў вядзецца апрацоўка фунгіцыдамі. У сувязі з кароткім вегетацыйным перыядам трэба падбіраць адпаведныя гібрыды, каб не зацягваць з уборкай.

На жаль, заспець яе саму не давялося — увесь ураджай дзякуючы цёпламу надвор'ю ў гаспадарцы сабралі на мінулым тыдні. Затое можна ўбачыць на мехдвары даволі цікавы агрэгат — спецыяльную жняярку для сланечніку. Гэта новая распрацоўка гомельскіх машынабудаўнікоў. Дарэчы, агрэгат можа ісці не толькі па даўжыні і шырыні поля, але і па дыяганалі, што дазваляе пазбегнуць страт.

Камбайн зрэзвае сцябло каля кошыкаў сланечніку, жняярка іх забірае, а потым адпраўляе ў малацільны бункер. На выхадзе застаюцца толькі семечкі. Яны прасушваюцца, калі трэба, затым паступаюць на склад.

— У нашых кліматычных умовах сланечнікам займацца можна, гэта рэнтабельная культура, проста трэба дакладна вывучыць тэхналогію яе апрацоўкі, усё падрыхтаваць загадзя, як таго патрабуе любая культура, — разважае Юрый Вялічка. — Сэнс у тым, каб атрымаць буйное насенне, якое дасць лепшыя ўсходы.

Пакуль тут выкарыстоўваюць поўнасцю закупное насенне, сваё — толькі гібрыды першага пакалення. Але закупкі не асабліва адбіваюцца на рэнтабельнасці, бо складаюць толькі 5 % сабекошту прадукцыі. Гэты год аказаўся больш удалы. Зрэшты, не толькі па ўраджайнасці сланечніку. Напрыклад, збожжавых культур тут атрымалі больш за сто цэнтнераў з гектара. Сабраны рэкордны ўраджай рапсу — важнай кармавой культуры.

Па словах галоўнага агранома, важную ролю ў тым адыграла так званае дакладнае земляробства. Гэта цэлая сістэма апрацоўкі, якая прадугледжвае комплексны падыход да працэсу вырошчвання раслін на аснове складзеных электронных картаў палёў, на якіх выконваецца зададзены праграмай алгарытм работы. Механізатар устаўляе флэш-карту з заданнем у бартавы камп'ютар і проста кіруе тэхнікай, а агрэгат сам ведае, што сеяць, колькі ўносіць угнаенняў альбо сродкаў аховы раслін.

— Да гэтага нас прымусіла няроўная мясцовасць, што накладвае свой адбітак на ўраджай. Ёсць участкі поля з высокай урадлівасцю, а на пагорках яна нізкая. Дзякуючы электроннай платформе мы можам вызначыць урадлівасць, напрыклад, за пяць альбо восем гадоў. З гэтага і задаецца праграма для кожнага поля. Калі перайшлі на дакладнае земляробства, сярэдняя ўраджайнасць збожжавых і рапсу значна ўзрасла, сёлета стала яшчэ вышэйшай, — расказвае суразмоўнік.

Што датычыць сланечніку, культура ўжо займае сваё месца ў севазвароце СВК «Гродзенскі». Гэта прадыктавана ўдасканаленнем кармавой базы — такім чынам папаўняецца бялок у рацыёне кармлення статка. Між тым перапрацоўка сланечніку пакуль не вельмі развітая з-за таго, што ён цяжка праходзіць праз прэс, у адрозненне ад таго ж рапсу. Калі рапс перапрацоўваецца ў вялікіх аб'ёмах, то сланечнік — культура хутчэй эксперыментальная. Многія гаспадаркі пакуль толькі прыглядаюцца да яе. Аргументам на карысць вырошчвання сланечніку можа быць той факт, што можна атрымліваць рэнтабельную прадукцыю не з самых лепшых палёў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

### ❍ У тэму

Найбольшая ўвага ў вырошчванні сланечніку аддаецца ў Гродзенскім раёне. Тут культывацыяй гэтай культуры займаецца шэсць гаспадарак, у асноўным сеюць разам з кукурузай. Але некаторыя, як, напрыклад, СВК «Гродзенскі», вырошчваюць сланечнік у чыстым выглядзе. Кожная гаспадарка шукае магчымасць атрымаць эканамічны эфект.

Як паведамілі ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі Гродзенскага аблвыканкама, пакуль заўчасна адводзіць вялікія плошчы пад сяўбу гэтай паўднёвай культуры. Адна з прычын — невысокая цана рэалізацыі семечак. У асноўным культура ідзе на сілас як зялёная маса. Таксама выказваецца думка, што пасевы сланечніку збядняюць глебу, на ёй пасля дрэнна растуць тыя ж збожжавыя культуры. Як выхад — займацца павышэннем урадлівасці зямлі на такіх участках.

Будзь у курсе!

# СТРЭЛЬБЫ МОЖНА РАСЧАХЛЯЦЬ

## Пачынаецца сезон загоннага палявання

**У адпаведнасці з Правіламі палявання, з 1 кастрычніка да 31 снежня ў краіне акрамя ружэйнага палявання з засады і з падыходу дазваляецца ружэйнае загоннае паляванне на паляўнічых жывёл нарміраваных відаў (лось, дзік, алень высакародны, алень плямісты, лань, муфлон). Паляваць можна загонам і з сабакамі ў светлы час сутак, з засады і з падыходу — на працягу сутак.**



Як нагадвае прэс-служба Міністэрства лясной гаспадаркі, пры гэтым можна выкарыстоўваць:

— для здабычы лася, аленя высакароднага, лані, дарослага дзіка старэйшых за два гады: наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 3000 джоуляў, гладкаствольную паляўнічую зброю з патронамі з куляй, паляўнічыя лукі і арбалеты;

— для здабычы аленя плямістага, казулі, муфлона і маладняку дзіка: наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 1500 джоуляў, гладкаствольную паляўнічую зброю з патронамі з куляй або карцеччу, паляўнічыя лукі і арбалеты;

— паляўнічых сабак: пароды па рашэнні карыстальніка паляўнічых угоддзяў.

Загонныя паляванні з'яўляюцца зонай павышанай рызыкі і патрабуюць ад яе ўдзельнікаў яшчэ большай адказнасці, асабліва ад кіраўнікоў палявання.

Трэба адзначыць, што, нягледзячы на неаднаразовыя патрабаванні Міністэрства лясной гаспадаркі аб неабходнасці прыняцця дадатковых мер па забеспячэнні захавання правілаў бяспекі на паляванні, маюць месца няшчасныя выпадкі, у тым ліку са смяротным зыходам.

Асноўнай прычынай смяротнага траўміравання ўдзельнікаў палявання з'яўляюцца элементарнае невыкананне правілаў бяспекі яго правядзення, якія рэгламентаваны главой 6 Правілаў палявання, самімі ўдзельнікамі палявання пры яго легальным правядзенні.

Асноўнымі парушэннямі з'яўляюцца:

— стральба на шум, шоргат, па невыразна бачнай цэлі, у тумане, у моцны снегапад, у прыцемках, супраць сонца і пры іншых умовах дрэннай бачнасці, а таксама па птушцы, якая ўзлятае ніжэй чым 2,5 метра ва ўмовах абмежаванай бачнасці;

— стральба да таго, як паляўнічы папярэдне не пераканаецца ў тым, што ў напрамку стрэлу няма людзей або хатніх жывёл;

— пры правядзенні загоннага палявання: вядзенне стральбы па паляўнічых жывёлах уздоўж стралковай лініі, за межамі свайго сектара, пасля сігналу аб заканчэнні загону, самастойным выбары месца і сыходзе з нумара да заканчэння загону.

У сувязі з адкрыццём загоннага палявання, у мэтах прадухілення няшчасных выпадкаў пры правядзенні паляванняў, усім карыстальнікам паляўнічых угоддзяў неабходна арганізаваць дадатковае навучанне службовых асоб (кіраўнікоў палявання) правілам бяспекі палявання.

Таксама Мінлясгас звяртае ўвагу на неабходнасць выканання патрабавання абзаца трэцяга пункта 35 Правілаў палявання, згодна з якім пры рэалізацыі паляўнічай пуцёўкі, дазволу і (або) паляўнічай пуцёўкі да дазволу службовая асоба карыстальніка паляўнічых угоддзяў або яго вышэйстаячай арганізацыі, або іншай арганізацыі, якая заключыла дагавор на рэалізацыю паляўнічых пуцёвак з карыстальнікам паляўнічых угоддзяў, абавязаны азнаёміць паляўнічага з межамі адзінак унутрыгаспадарчага дзялення тэрыторыі паляўнічых угоддзяў, у якіх яму дазваляецца праводзіць паляванне, з устаноўленымі ў паляўнічых угоддзях парадкам правядзення палявання і правіламі бяспекі палявання, пасля чаго паляўнічы распісваецца пра азнаямленне ў паляўнічай пуцёўцы да дазволу.

Калі ў час палявання адбыўся няшчасны выпадак, кіраўнік палявання абавязаны неадкладна праінфармаваць аб няшчасным выпадку органы ўнутраных спраў, кіраўніка карыстальніка паляўнічых угоддзяў, Дзяржаўную інспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# ТУМАНЫ, А ЎНАЧЫ ЎСЁ ХАЛАДНЕЙ...

**Разам з тым сярэдняя тэмпература паветра па краіне будзе значна вышэйшай за норму: у апошнія дні верасня месцамі можа прыгрэць да 20—27 градусаў.**

Як паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, у аўторак умовы надвор'я ў нашай краіне будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца невялікая воблачнасць. Пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах будзе згушчацца слабы туман. Вецер няўстойлівы слабы. Тэмпература паветра мінімальная ноччу 2—8 цяпла, месцамі па паўднёвай палове краіны 9—13 градусаў. А вось максімальная тэмпература днём падымецца ад 18 градусаў па поўначы краіны да 26 цяпла па паўднёвым захадзе нашага рэгіёна. Атмасферны ціск ноччу істотна не зменіцца, днём будзе слаба падаць.

У сераду і чацвер умовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць заходняя перыферыя антыцыклону, які будзе размяшчацца над цэнтральнымі раёнамі еўрапейскай часткі Расіі. Чакаецца пераменная воблачнасць. Без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі па краіне будзе згушчацца слабы туман. Вецер паўднёвай чвэрці ноччу слабы, днём умераны. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да 3 цяпла на ўсходзе краіны, але падымецца да 14 градусаў на захадзе. Днём будзе амаль па-летняму камфортна — ад 20 да 27 градусаў цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Ураджай

# ВАЖКІ КАРАВАЙ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

## Хлебаробы вобласці падвялі вынікі жніва на «Дажынках-2023» у Зэльве

**Да традыцыйнага фестывалю-кірмашу рэгіён прыйшоў з добрымі вынікамі. Намалочана больш за 1,7 мільёна тон зерня. Сярэдняя ўраджайнасць склала 47 цэнтнераў з гектара — найлепшы паказчык у краіне. Са значнымі дасягненнямі гродзенцаў віншавалі высокія госці.**



### У ГОНАР ПЕРАДАВІКОЎ

Як адзначыў **дзяржсакратар Савета бяспекі Беларусі, упаўнаважаны кіраўніка дзяржавы па Гродзенскай вобласці Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ,** харчовая бяспека з'яўляецца найважнейшым фактарам абароны нацыянальных інтарэсаў і дазваляе праводзіць незалежную эканамічную палітыку ва ўмовах беспрэцэдэнтнага санкцыйнага ціску. Прадстаўнік Прэзідэнта зачытаў прывітальны ліст кіраўніка дзяржавы. «Гродзеншчына паказала найлепшы вынік па краіне. Атрыманы рэкордны ўраджай азімага рапсу. Цяпер ідзе ўборка іншых сельскагаспадарчых культур. Упэўнены ў вашых далейшых поспехах на ніве стварэння», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Высокія вынікі паказалі Гродзенскі, Ваўкавыскі, Карэліцкі і Шчучынскі раёны, дзе намалот зерня перавысіў сто тысяч тон, шэсць сельгаспрадпрыемстваў атрымалі ўраджайнасць звыш ста цэнтнераў з гектара. А ў вытворчым кааператыве імя В. І. Крамко і СВК «Гродзенскі» гэты паказчык дасягае амаль 120 ц/га.

Увогуле з дзевяці сельгаспрадпрыемстваў краіны, якія перавысілі 100 ц/га, сем — гаспадаркі Гродзеншчыны. Толькі тут працуюць два экіпажы камбайнераў, якія перавысілі адзнаку ў пяць тысяч тон, падкрэсліў у сваім выступленні **намеснік прэм'ер-міністра Леанід ЗАЯЦ.** Ён таксама выказаў упэўненасць, што разам з кукурузай вобласць можа дасягнуць і двух мільёнаў тон.

Такі вынік стаў магчымым дзякуючы агульным намаганням усіх, хто мае дачыненне да работы ў сельскай гаспадарцы — ад простых работнікаў да кіраўнікоў многіх галін вытворчасці. Важную ролю адыгралі вопыт ветэранаў і энергія маладых, упэўнены **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК.**

— Усе разам мы яшчэ раз даказалі, што сакрэт поспеху гродзенскай зямлі — не якісці асаблівы клімат ці склад глебы. Асноўны сакрэт — гэта людзі, якія любяць і ўмеюць працаваць, і робяць тое разам. Прыемна, што фестываль «Дажынкі» дае магчымасць выказаць словы шчырай падзякі людзям працы, — адзначыў губернатар.

Аднымі з першых узнагароды атрымалі пераможцы абласнога спаборніцтва сярод раёнаў. На першым месцы — Гродзенскі раён (старшыня райвыканкама Валерый Хелскі), другое месца ў Бераставіцкага раёна (старшыня Антон Кулісевіч), трэцяя пазіцыя — у Шчучынскага раёна (старшыня Аляксей Садоўскі). Таксама ўзнагароды ўручаны сельгаспрадпрыемствам. Граматы, дыпломы, падзякі, падарункі атрымалі дзясяткі хлебаробаў Гродзеншчыны.

### АДРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫЙ

Галоўныя атрыбуты кірмашу ў Зэльве здзіўлялі фантазіяй аўтараў. Кожны раён прадставіў на конкурс свой адметны каравай. Але не толькі. Выпечкай частавалі гасцей на кожным імправізаваным падворку.

Давялося апынуцца і на полі цудаў, амаль як у папулярнай тэлегульні. Такую незвычайную лакацыю прапанаваў Смаргонскі раён. Але «барабан» тут з мясцовым акцэнтам. На ім размешчаны тамтэйшыя прысмакі, у першую чаргу розных памераў смаргонскія абаранкі, якія лічацца брэндам горада. Славіўся раён і так званай мядзведжай акадэміяй. Таму на «барабане» можна ўбачыць выпечку ў выглядзе медзведзянят. Які сектар спыніўся перад госцем, — такі ласунак ён і выбірае.

Падворак Слонімскага раёна прадставіў знакаміты паўлаўскі каравай, які ўваходзіць у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Тут і вясельны каравай, і гасцявы, і велікодны...

— Мы працягваем папулярызаваць нашы традыцыі, праводзім майстар-класы, дзе дзеткі вучацца рабіць упрыгажэнні да нашага каравая, ім вельмі падабаецца, гуляем з імі ў народныя гульні, — паведаміла кіраўнік народнага калектыву «Чараўніцы-каравайніцы» Дар'я Кірыенка. — Сёння адраджаецца такая традыцыя, калі на многія святы людзі заказваюць адмысловыя караваі, мы з задавальненнем адгукаемся.

Цікавая экспазіцыя разгарнулася на падворку Свіслацкага раёна, дзе эпіцэнтрам падзей «Бацькава булка». Брэндавае свята з такой назвай праводзіцца там нядаўна і завявала папулярнасць у мясцічаў.

— Чаму мы прывезлі такую пляцоўку на абласныя «Дажынкі»? Бо ўбачылі, як успрымаюць гэту лакацыю нашы жыхары, і вырашылі прадставіць яе больш шырока. Мы сёлета другі раз правялі ў раёне такое свята, а тут проста прадставілі яго. Для таго каб зразумець, што гэта такое, трэба паўдзельнічаць ва ўсім працэсе прыгатавання нашай знакамітай булкі-пляцёнкі, — запэўніла **дырэктар Свіслацкага раённага Дома культуры і народнай творчасці Таццяна МАЦКЕВІЧ.**

Кожны падворак прадставіў раённыя брэндавыя святы. З году ў год традыцыя ўдасканальваецца. Гэта самыя запатрабаваныя пляцоўкі, паведаміла **начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена КЛІМОВІЧ.** Тэмай сёлетняга фестывалю-кірмашу сталі святы, звязаныя з сельскай гаспадаркай. Таксама адметнымі сталі майстар-класы, выступленні творчых калектываў, дэгустацыя стравы, характэрнай для раёна.

### ХТО ПРЫМЕ ЭСТАФЕТУ

З кожным годам фестываль становіцца ўсё больш маштабным і відовішчным. Вядзецца вялікая падрыхтоўчая работа. Для населенага пункта — гонар праводзіць такі знакаміты фестываль хлебаробаў. Налета «Дажынкі» будзе прымаць горад Масты. Адпаведны вымпел **старшыні Мастоўскага райвыканкама Андрэю САНЬКО перадаў кіраўнік Зэльвенскага раёна Дзяніс АЛЬШЭЎСКІ.**

Дарэчы, з горадам Масты звязаная і гісторыя самага знакамітага фестывалю, які стаў праводзіцца па ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Традыцыйна свята прымаюць райцэнтры краіны. Першыя рэспубліканскія «Дажынкі» прайшлі ў 1996 годзе ў Століне. А ў наступным, 1997-м Масты сталі другім горадам, які прыняў галоўнае восеньскае свята. Тады ж у сваім выступленні Прэзідэнт падкрэсліў значнасць «Дажынак», неабходнасць заўсёды дзякаваць хлебаробам.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# Каб быў хлеб... і да хлеба

**Хлебаробы Віцебскага раёна першымі ў паўночным рэгіёне адзначылі «Дажынкі-2023». На галоўнае аграрнае свята сабраліся сотні мясцовых жыхароў, а таксама госці з суседняга Веліжскага раёна Расіі.**

Сёлета пляцоўкай для правядзення раённага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі стаў аграгарадок Альгова, які да свята набыў новы выгляд. Абнавілася і інфраструктура населенага пункта: кіраўніцтва вобласці і раёна ўзяло ўдзел у адкрыцці пасля рэканструкцыі фельчарска-акушэрскага пункта. З'явілася ў аграгарадку таксама сучаснае паштовае аддзяленне.

Ад імя кіраўніцтва паўночнага рэгіёна са святам усіх прысутных павіншавала намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Нікіціна. Яна падкрэсліла, што прыдзвінцы традыцыйна выходзяць лідарамі падчас уборачнай кампаніі, у гэтых працаўнікоў ёсць чаму павучыцца. Яна ўручыла перадавікам падзякі старшыні Віцебскага аблвыканкама, а кіраўнік раёна Генадзь Сабыніч уручыў хлебаробам ганаровыя граматы і заслужаныя ўзнагароды. «Нягледзячы на тое, што сёлета нябесная канцылярыя крыху сапсавала планы аграрыяў, вы выдатна вытрымалі іспыты. Агульны намалот ста экіпажаў склаў больш за 73,2 тысячы тон збожжа, 24 экіпажы пераадолелі мяжу ў тысячу тон. Шчыры дзякуй вам, паважаныя хлебаробы, за адданасць і вернасць нялёгкай сельскагаспадарчай працы», — адзначыў Генадзь Генадзевіч.

На падворкі з традыцыйнымі беларускімі стравамі, адметнай гарбатай і квэстамі запрашалі сельскія Саветы і ўстановы адукацыі. Па-сапраўднаму захапляльным для гасцей быў хлебны рад з адмысловых караваяў. На майстар-класы па саломапляценні і вырабе сувенірнай прадукцыі запрашалі дарослых і дзяцей рамеснікі раёна. Асаблівым попытам у малых карысталіся інтэрактыўныя пляцоўкі ратавальнікаў.

На свяце аб'явілі наступную сталіцу раённых «Дажынак» — налета прымаць гасцей будзе аграгарадок Мазалава.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

З нагоды

# Жалезная аснова эканомікі

**У Віцебску шырока адзначылі Дзень машынабудаўніка. Выстава тэхнікі і прадукцыі арганізацый Мінпрама стала часткай рэспубліканскага свята. Паўночная сталіца — другі горад краіны, які перадаў гэтую эстафету Брэсту.**

На плошчы Свабоды прайшла выстава тэхнікі, якая выпускаецца арганізацыямі Міністэрства прамысловасці. Можна было ўбачыць самыя актуальныя і сучасныя мадэлі такіх буйных беларускіх вытворцаў, як Geely, «Гомсельмаш», Віцязь, БелАЗ, ЗЛіН, Мінскі маторны завод, «Лідаграпраммаш», «Бабруйскаграмаш», «Оршаграмаш».

Паколькі тэрыторыя абмежаваная, на плошчы Свабоды прадставілі не ўсю тэхніку, а толькі самыя інавацыйныя рашэнні: беспілотны трактар, самаходныя машыны, лінейку грузавой і пасажырскай тэхнікі МАЗа. Іншыя прадпрыемствы выставілі прадукцыю народнага спажывання: халадзільнікі, тэлевізары, аптычныя прыборы і нават тавары для кухні — чыгунныя патэльні.

Галоўныя ўрачыстасці прайшлі ў канцэртнай зале «Віцебск», з нагоды прафесійнага свята ўзнагародамі адзначаны каля 70 найлепшых машынабудаўнікоў краіны.

«Сёння Віцебск ператвараўся ў сталіцу машынабудаўнікоў, у якой сабраліся кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, ветэраны і моладзь, перадавікі вытворчасці машынабудаўнічай галіны з усёй краіны. Канцэпцыя мерапрыемства «Да міру шляхам стварэння» кажа пра тое, што ў нас выдатная гісторыя развіцця прадпрыемстваў, флагманаў машынабудавання, тэхнікі, якая стала брэндам нашай краіны. Віцебшчына таксама багатая сваёй гісторыяй машынабудавання. У паўночным рэгіёне працуе амаль 50 прадпрыемстваў машынабудаўнічай галіны розных формаў уласнасці. Яны выпускаюць і рэалізоўваюць трацыну сваёй прадукцыі на экспарт. Нашы прадпрыемствы ўзгадавалі нямала пакаленняў машынабудаўнікоў рэгіёна. Магчыма, хтосьці з прадстаўнікоў маладога пакалення, прыйшоўшы на гэтае свята, абавязкова захоча папоўніць вялікую, дружную сям'ю машынабудаўнікоў», — адзначыла намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Нікіціна.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта павіншаваў работнікаў галіны з прафесійным святам і нагадаў, як развівалася прамысловасць у краіне. «Хацеў звярнуцца да таго перыяду, з якога ўсё пачыналася, — пачатак 90-х, калі гучалі ідэі парэзаць усё, закрыць, калі казалі вельмі шмат, што такая невялікая дзяржава, як Беларусь, практычна не мае права мець такую развітую прамысловасць: не будзе куды прадаваць, не будзе каму вырабляць, ды і наогул гэта не трэба. І нават у апошні час, успомніце, колькі размоў пра IT, якія выратуюць свет, штучны інтэлект і гэтак далей, — нічога падобнага. Дык вось, у тыя 90-я менавіта кіраўнік нашай дзяржавы Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка дамогся разумення ў нас усіх, перш за ўсё ў кіраўнікоў галіны, канструктараў, інжынераў, што яны патрэбныя сваёй краіне. Што мы, невялікая дзяржава, выстаім. І не толькі на тым базісе, які застаўся ад Савецкага Саюза (захаваем існуючы патэнцыял), але і прымножым яго, стаўшы ў адзін шраг з магутнымі вытворцамі прамысловай тэхнікі, абсталявання, прыбораў, шырока вядомых ва ўсім свеце. Менавіта Прэзідэнт на працягу доўгага часу сваімі магутнымі плячыма расштурхваў гэтыя нішы для нашых тавараў за мяжой, для рэалізацыі нашых задум на самым высокім узроўні», — сказаў Максім Рыжанкоў.



Фота «Віцебскія весці».

Паўночны рэгіён таксама атрымаў падарунак ад кіраўніцтва краіны: намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Пётр Пархомчык уручыў гасціннай Віцебшчыне сертыфікат на збожжаўборачны камбайн GS12A1 PRO, які прыняла намеснік старшыні аблвыканкама Анжаліка Нікіціна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ID-КАРТКАВЫ КЛЮЧ ДА АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ ДЗВЯРЭЙ

## Выгоды пластыкавага дакумента перад папяровым пашпартам

**Два гады таму Беларусь стала на новыя лічбавыя рэйкі — у краіне пачалася выдача новых лічбавых біяметрычных дакументаў. Гэта ID-картка, якая патрэбна для выкарыстання ўнутры дзяржавы, то-бок пасведчанне грамадзяніна.**
**А таксама біяметрычны пашпарт, які служыць для сведчання асобы беларуса за межамі краіны. Чалавеку, які з дапамогай ID-карткі аўтарызаваўся на адзіным партале электронных паслуг — сэрцы лічбавага свету па атрыманні розных паслуг і сэрвісаў ад дзяржавы, сёння даступна больш за 300 сэрвісаў, з іх больш за 50 — для фізічных асоб. Сёлета ўжо аказана 85 мільёнаў лічбавых паслуг (летась за ўвесь год было 76 мільёнаў). І колькасць сэрвісаў, даступных у лічбавай прасторы, паступова расце. Пра свежыя навінкі расказалі ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг (НЦЭП).**

### СРОДАК ДОСТУПУ, А НЕ НОСЬБІТ

Беларус можа мець два біяметрычныя пашпарты, што вельмі зручна, калі трэба, напрыклад, адкрыць візу, для чаго неабходна ехаць у іншую краіну. Адзін пашпарт можна пакінуць у пасольстве, а па другім біяметрычным пашпарце вярнуцца ў Беларусь, расказала **Святлана КАРАНЕВІЧ, начальнік аддзела электроннай камерцыі НЦЭП:**

— *Тэхнічна ID-картка гатовая для таго, каб яе можна было выкарыстоўваць для выезду за мяжу — на ёй ёсць прылада ICAO, якая зроблена па міжнародных стандартах і дазваляе беларусу засведчыць сябе. Тады папяровы біяметрычны пашпарт будзе ўвогуле непатрэбны. Аднак для гэтага неабходна мець адпаведныя пагадненні з тымі краінамі, якія захочуць супрацоўнічаць з намі такім чынам. Думаецца, што ў хуткай будучыні можна будзе адмовіцца ад біяметрычных пашпартоў і карыстацца толькі ID-карткай, у тым ліку для выезду за мяжу.*

ID-картка — ключ доступу да пэўных сістэм, дзе чалавек можа аўтарызавацца і набываць нейкія паслугі. Яна з'яўляецца носьбітам толькі дзвюх прылад: ідэнтыфікацыйнай і электроннага лічбавага подпісу (ЭЛП). Абедзве прылады дазваляюць любому беларусу ідэнтыфікавацца ў любой з інфармацыйных сістэм і рэалізаваць некаторыя свае правы ці атрымаць пэўныя паўнамоцтвы. А ЭЛП на ID-картцы дазваляе здзяйсняць юрыдычна значныя дзеянні.

— *Раней, калі чалавек хацеў скарыстацца функцыямі лічбавага подпісу, ён мусіў ісці ў рэгістрацыйны цэнтр, дзе атрымліваў ЭЛП, тэрмін дзеяння якога абмяжоўваўся годам, двума ці трыма. Трэба было кантраляваць надыход гэтай даты, зноў ісці ў цэнтр і прадаўжаць тэрмін дзеяння ЭЛП (і зноў плаціць за гэта грошы), — нагадала спецыяліст. — Цяпер жа лічбавы подпіс утрымліваецца на ID-картцы па ўмаўчанні і дзейнічае столькі ж, колькі сам дакумент, — дзесяць гадоў.*

Міністэрства аховы здароўя, напрыклад, працуе над стварэннем цэнтралізаванай інфармацыйнай сістэмы аховы здароўя, каб гісторыя ўсіх зваротаў хворага ў медустановы таксама стала электроннай. Гэта і электронны пашпарт вакцынацыі, і дыспансерызацыя, і перавод у электронны выгляд амбулаторных картак хворага і лістоў непрацаздольнасці, а таксама магчымасць аўтаматычна накіроўваць у асабісты кабінет чалавека на партале даных пра наведванне ім пэўных медустаноў для стварэння цэльнай медгісторыі. Пакуль гэта ўсё ў распрацоўцы.

— *І нават тады, калі гэта будзе рэалізавана, ні рэцэпта, ні медкарты на ID-картцы не будзе — усе звесткі будуць непасрэдна на адзіным партале, які адмыкаецца з дапамогай ідэнтыфікацыйнага дакумента чалавека, — удакладніла прадстаўніца НЦЭП. — На ID-картцы застанецца толькі ідэнтыфікацыйная прылада і ЭЛП. А той жа электронны рэцэпт, ідэя якога ўжо, дарэчы, рэалізавана, бачыць урач, які яго выпісаў, і фармацэўт, які па ім выдасць лекі. Аднак абодва спецыялісты, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой на карысць канкрэтнага пацыента, бачаць рэцэпт у інфармацыйнай сістэме, а не на ID-картцы пацыента, з дапамогай якой ён толькі ідэнтыфікуе сваю асобу. І такіх працэдур, калі дзяржорганы ці юрасобы ўзаемадзейнічаюць паміж сабой на карысць фізічнай асобы, шмат. У прынцыпе, менавіта з гэтай мэтай і стварыўся партал.*

### БОЛЬШ СЭРВІСАЎ — БОЛЬШ ЦІКАВАСЦІ

На жаль, інфраструктура для выкарыстання ЭЛП на ID-картцы менавіта фізічнымі асобамі не такая вялікая — паслуг і сэрвісаў, для якіх трэба ідэнтыфікаваць сябе ў лічбавым свеце з дапамогай ID-карткі, не так шмат. Таму актуальная задача — папулярызаваць ID-картку (тым самым павысіўшы цікавасць грамадзян да яе выкарыстання) за кошт павелічэння сэрвісаў.

У Беларусі дзейнічае распараджэнне прэм'ер-міністра № 119р, дзе распісана, якія адміністрацыйныя працэдуры да 2025 года павінны быць пераведзены ў электронны выгляд. Цяпер іх у краіне больш за тысячу, бо гэта амаль кожнае дзеянне чалавека: хоча ён папрасіць, каб ссеклі дрэва пад акном, запісаць дзіця ў чаргу ў дзіцячы садок або атрымаць патэнт на сваё даследаванне, паведаміла Святлана Караневіч:

— *Сёння на партале з 307 сэрвісаў 112 — адміністрацыйныя працэдуры, так што работы яшчэ шмат. Практыка паказвае, што і 307 лічбавымі сэрвісамі актыўна карыстаюцца і дзяржорганы, і юрасобы, і грамадзяне. І паступова колькасць сэрвісаў расце, бо да адзінага партала са сваімі магчымасцямі і новымі інфармацыйнымі сістэмамі (з цікавай для людзей інфармацыяй) далучаюцца новыя ведамствы і міністэрствы. У лідарах сярод тых, хто актыўна ўкараняе свае базы ў лічбавае асяроддзе, — Міністэрства ўнутраных спраў, Мытны камітэт, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Чым больш адміністрацыйных дзвярэй (магчымасць заказу лічбавых сэрвісаў і адмінпрацэдур) зможа адмыкаць беларус з дапамогай ID-карткавага ключа, тым больш прываблівым будзе выкарыстанне грамадзянамі гэтага дакумента.*

Да канца 2023-га, згодна з дакументам № 119р, у электронны выгляд павінна быць пераведзена, напрыклад, каля 130 адмінпрацэдур у сферы зямельна-маёмасных стасункаў. Гэта ўсё, што датычыцца правоў на нерухомасць і яе адчужэння. Актыўна ствараюць дакументы для пераводу паслуг у лічбу Міністэрства прыродных рэсурсаў, Міністэрства спорту, Мінсельгасхарч.

Стварэнне праграмнае забеспячэнне для пераводу адмінпрацэдур у электронны выгляд можа не толькі цэнтр электронных паслуг, які з'яўляецца аператарам адзінага партала, але і яшчэ два суб'екты. А да 2025 года, як мяркуецца, з'явіцца тэставае асяроддзе ў канструктары электронных паслуг і сэрвісаў, дзе, уласна кажучы, і адбываецца ўся распрацоўка. Тады ў канструктар можна будзе допускаць пабочных распрацоўшчыкаў, што яшчэ больш паскорыць працу. Большасць часу і пытанняў займае якраз не стварэнне праграмнага забеспячэння, а падрыхтоўка неабходных дакументаў, дадала начальнік аддзела.



### ПРА РЭГІСТРАЦЫЮ, СЯМ'Ю, АЎТО, ПРАВАПАРУШЭННІ І ГРАМАДЗЯНСТВА

Колькасць лічбавых паслуг, даступных па строгай аўтэнтыфікацыі (з выкарыстаннем ID-карткі), штогод павялічваецца. Толькі сёлета іх стала больш на 60. Самае актыўнае ў справе лічбавізацыі ведамства — Міністэрства ўнутраных спраў (МУС). Па ўмаўчанні асабістыя кабінеты беларусаў ствараюцца на падставе звестак з рэгістра насельніцтва МУС. Штодня гэтая інфармацыя актуалізуецца, каб ствараліся новыя кабінеты і блакіраваліся кабінеты памерлых асоб, заўважыла Святлана Караневіч:

— *З агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмай (АДІС) інтэгравана яшчэ некалькі рэсурсаў МУС: рэгістрацыйны ўлік, з дапамогай якога можна даведацца месца рэгістрацыі, сямейнае становішча і наяўнасць дзяцей. Звесткі з гэтага рэсурсу і з рэгістра насельніцтва прадастаўляюць даныя, якія адсутнічаюць на ID-картцы, і запытаў на іх атрыманне мноства, што сведчыць пра выкарыстанне беларусамі новых пашпартоў.*

Праз МУС у лічбавае асяроддзе інтэгравана таксама АІС «Пашпарт» — сістэма, якая да з'яўлення рэгістра насельніцтва вяла ўлік машыначытальных дакументаў, то-бок папяровых пашпартоў, відаў на жыхарства, пасведчанняў бежанца. Шмат электронных паслуг і адмінпрацэдур арыентавана на тое, каб запаўняць даныя пра заяўніка не ўручную, а на падставе запыту ў АІС «Пашпарт». У сістэму ўводзіцца нумар пашпарта, ціснецца кнопка «пошук» — і даныя запаўняюцца аўтаматычна, падкрэсліла спецыяліст.

У юрысдыкцыі МУС знаходзіцца і сістэма «Адзіны дзяржаўны банк даных аб правапарушэннях» (з яе чалавек можа атрымаць даведку пра наяўнасць ці адсутнасць уласных правапарушэнняў, напрыклад пры працаўладкаванні). А яшчэ — некалькі рэсурсаў, інтэграваных па лініі ДАІ. У прыватнасці, комплексная паслуга «Прадастаўленне сістэматызаваных звестак пра аўто».

Не так даўно МУС рэалізавала новую паслугу, даступную толькі па строгай аўтэнтыфікацыі (з выкарыстаннем ID-карткі) — 3.77.01 «Інфармаванне аб наяўнасці (спыненні) грамадзянства (падданства) замежнай дзяржавы, віду на жыхарства ці іншага дакумента замежнай дзяржавы, які прадастаўляе правы на ільготы і іншыя перавагі». Аднак іншаземцы, у якіх няма ЭЛП Беларусі, выкарыстаць яе не могуць, адзначыла Святлана Караневіч.

— *Гэтая паслуга можа спатрэбіцца, напрыклад, беларусам, якія маюць карту паляка або від на жыхарства ў Літве. Аднак каб паведаміць пра гэта МУС, трэба мець ЭЛП Беларусі.*

У верасні з'явілася таксама паслуга, у рамках якой можна праверыць любы тып дакументаў. Раней праверыць можна было толькі асобны дакумент: з дапамогай адной паслугі — пашпарт, з дапамогай іншай — ID-картку, пасведчанне бежанца і г. д. Гэта будзе зручным і для прадстаўнікоў банкаў, і аператараў электрасувязі, да якіх звяртаюцца людзі з рознымі тыпамі дакументаў.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

НЦЭУ
ID-карта наблізіць кожнага да лічбавай дзяржавы!
ID-карта – лічбавы аналаг пашпарта, дакумент, які сведчыць асобу, для выкарыстання ўнутры краіны.
Перавагі ID-карты:
• абарона ад падробак;
• наяўнасць электроннага лічбавага подпісу тэрмінам на 10 гадоў;
• скарачэнне часу на атрыманне электронных паслуг і адміністрацыйных працэдур.

Нацыянальны цэнтр электронных паслуг. УНП 191700161
Падрабязней – на адзіным партале электронных паслуг platform.gov.by

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В.П. извещает о проведении 9 октября 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** Затраты по переоформлению документов на переход права собственности возлагаются на Покупателя | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-81185**, общей площадью **3 264,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное.** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **Капитальное строение с инв. № 350/С-167549**, общей площадью **7,7** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное (проходная).** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006414** общей площадью **0,2036 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **Капитальное строение с инв. № 350/С-190188**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **водопроводная сеть.** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, водопроводная сеть от ВК1 до зданий по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006040 (присвоен предварительно). **Капитальное строение с инв. № 350/С-167548**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **тепловая сеть.** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, тепловая сеть, от ТК-1 до здания по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002005572 (присвоен предварительно). **Капитальное строение с инв. № 350/С-190467**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **дождевая канализационная сеть.** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, дождевая канализационная сеть по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006043(присвоен предварительно). **Капитальное строение с инв. № 350/С-190187**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **сеть канализации.** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, канализационная сеть от КК1 до КК7 по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006039 (присвоен предварительно). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006412** общей площадью **0,1070 га (право постоянного пользования, доля в праве – 33/50).** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **Также в состав лота № 1 входит:** сооружение – забор железобетонный (литер в, протяженность 52,8 м. п.). Сооружение – забор железобетонный (литер и, протяженность 53,92 м. п.). Сооружение – забор металлический (литер б, протяженность 13,1 м.п.). Сооружение – ворота металлические с электроприводом (литер г, протяженность 8,9 м. п., инв. № 255). Сооружение – ворота (литер д, протяженность 5,69 м. п., инв. № 01361030). Сооружение – тротуар (литер ж, площадью 31 кв. м, инв. № 01361033). Сооружение – бордюры (литер к, протяженность 57,52 м. п., инв. № 01361034). Сооружение – часть дворового покрытия, инв. № 01361031 (площадью 1 124,0 кв. м). Обдирочно-заточной станок 3Б632, инв. № н/д. Лифт грузовой без проводника, г/п 1000 кг, Зав. № 3508, 1979 года выпуска, инв. № н/д. Трансформатор трехфазный, зав. № 8657, тип ТМФ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1300 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1984 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. Трансформатор трехфазный, зав.№ 81666, тип ТМ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1420 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1972 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 1, размер 4,2х2,2х0,6м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 2, размер 4,2х2,2х0,6м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 3, размер 4,4х2,4х0,6м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 4, размер 4,8х2,4х0,6м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 5, размер 4,8х2,4х0,6м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 6, размер 4,8х2,4х0,6м, количество полок 6, инв. № н/д. Забор металлический (в разобранном виде) (литер а, протяженность 32,66 п.м., инв. № 01361028), расчетная масса металла – 136 кг | 1 682 078,40 | 168 207,84 |

**Продавец:** Коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 647-81-95 Сакович Вадим Павлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 26 сентября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 05 октября 2023 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 27.07.2023 г. № 143 (30023).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «ПРИЗЫ ЗА ЗАКАЗЫ В ПРИЛОЖЕНИИ КАТАЛОГ ONLINER 2»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Заинтересованное лицо рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «МИ БАЙ», юридический адрес: 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, пом. 21, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 291478180, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 26.06.2017.

3. Сроки проведения рекламной игры: с 07.08.2023 по 16.10.2023 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).

4. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4336, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 17.07.2023.

5. Количество участников рекламной игры – 1798 чел.

6. Информация о призовом фонде:

Размер призового фонда рекламной игры составляет 10 229 (десять тысяч двести двадцать девять) белорусских рублей 90 (девяносто) копеек. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

7. Информация о победителях рекламной игры:

| № п/п | Фамилия, инициалы победителя | Сведения о выигрыше |
|---|---|---|
| 1. | Луганская Н.В. | Приз (тур № 1) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |
| 2. | Янович П.А. | Приз (тур № 1) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |
| 3. | Андрейковец А.А. | Приз (тур № 2) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |
| 4. | Жаркевич К.И. | Приз (тур № 2) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |
| 5. | Осипчик М.А. | Приз (тур № 3) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |
| 6. | Канашевич П.А. | Приз (тур № 3) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |
| 7. | Нагорный С.Н. | Приз (тур № 4) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |
| 8. | Дервиш В.А. | Приз (тур № 4) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |
| 9. | Гришкевич А.С. | Приз (тур № 5) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |
| 10. | Котвицкий П.И. | Приз (тур № 5) – ELA5055GL телевизор жидко-кристаллический Xiaomi TV A2 43 (L43M7-EARU), денежные средства в размере 132,99 бел. руб. |

8. Для получения приза победители должны явиться не позднее 16.10.2023 (включительно) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2 этаж, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона: + 375 (29) 514 35 24.

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2023.Г.002.00090** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** РУП «Витебское племпредприятие», тел. +375 212 630094.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов**: **24.10.2023 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Автобус вагон (wagon) PAZ 32053 2008 г. в., рег. знак АВ 4169-2, цвет – белый, кузов (рама) № X1M3205C080007607, инв. № 41-62, находящийся по адресу: г. Витебск, пер. 1 Шумилинский, 1.

**Нач. цена: 4700,00 бел. руб. без учета НДС.**

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано 20.09.2023 на сайте Государственного комитета по имуществу http://gki.gov.by/ru/auction-auinf_estate/, на сайте Витебского облисполкома https://vitebsk-region.gov.by/ru/Aukciony-ru/.

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,** организатор торгов по продаже имущества **ОДО «ФАРМИН»** (УНП 190073936), объявляет о проведении **06.10.2023 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **в дер. Дуброва, ул. Охотская (объект 119/2021), дер. Рудомейка, ул. Центральная (объект 123/2021),** Озерицко-Слободского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

***Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | дер. Дуброва, ул. Охотская | 624883003801000371 | 0,1058 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | 30 000 |
| 2 | дер. Рудомейка, ул. Центральная | 624883008601000112 | 0,10 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | 20 000 |

**Аукцион состоится 27 октября 2023 г. в 15.00 в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, в зал заседаний (тел.: 801776, 50066).**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственный комитет по имуществу: https://au.nca.by/, Минского областного исполнительного комитета: https://info@minsk-region.gov.by, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by

# БЯСПЕКА РЭАЛЬНАЯ, ВІРТУАЛЬНАЯ, У НАВАЛЬНІЦУ І НА АДЛЕГЛАСЦІ

## Як засцерагчыся ад паражэння электрычнасцю і атручвання газам, расказалі эксперты

**За апошнія 20 гадоў у Беларусі адбылося 68 няшчасных выпадкаў электратраўматызму з дзецьмі (32 непаўналетнія пры гэтым загінулі). Сёлета, 24 жніўня, чацвёртакласнік касіў газон электракасілкай, падключанай да электрасеткі падаўжальнікам. У працэсе ён перарэзаў провад і вырашыў адрамантаваць яго (бачыў, як гэта робіць бацька), злучыўшы два канцы проваду, які так і застаўся падключаным да электрасеткі. Як вынік — удар токам. 14 верасня ў Баранавічах адразу два няшчасці з малымі. Дзяўчынка, якой няма і двух гадоў, атрымала электратраўму на кухні, дзе ішоў рамонт, дакрануўшыся да токавядучых частак разеткі (адтуліны ў разетцы для падключэння вілкі электрапрылад былі павялічаны). Другая паўтарагадовая дзяўчынка ненадоўга засталася без нагляду ў пакоі, але за гэты час паспела зламаць блок сілкавання тэлевізара, падключаны да разеткі, і атрымала траўму. На шчасце, абедзве малечы засталіся жывыя. Усяго сёлета ў выніку няшчасных выпадкаў ад паражэння электрычным токам пацярпела 26 чалавек (12 асоб, двое з якіх непаўналетнія, праз гэта памерлі). Што трэба ведаць, каб пазбегнуць бяды, прадухіліць няшчасныя выпадкі, расказалі эксперты.**



### КУЛЬТУРА І АБАВЯЗАК

Кожны чалавек штодня ўзаемадзейнічае з электра- і газазабяспечвальным абсталяваннем і прывык, што ўсе патрэбныя прылады пад рукой і дома, і на працы. Аднак не кожны і не заўжды ўяўляюць рызыку. Міністэрства энергетыкі цягам многіх гадоў праводзіць работу па прафілактыцы электра- і цеплатраўматызму, а таксама траўматызму пры карыстанні газам у побыце. Штогод пасля аналізу няшчасных выпадкаў Мінэнерга распрацоўвае комплекс прафілактычных мерапрыемстваў, паведаміў **Арцём МЕДВЯДОК, начальнік аддзела дзяржаўнага энергетычнага і газавага нагляду і аховы працы Мінэнерга:**

*— У комплекс работ уваходзяць мерапрыемствы па папярэджанні правапарушэнняў, якія садзейнічаюць узнікненню пажараў у жыллі; растлумачальная работа ў працоўных калектывах, сярод насельніцтва і навучэнцаў; распаўсюджванне сацыяльнай рэкламы; удзел у развіцці рэгіянальных адукацыйных цэнтраў. Па ініцыятыве Мінэнерга сёлета распрацавана і зацверджана канцэпцыя развіцця прафілактычнай дзейнасці органаў дзяржэнергагазнагляду — сістэма прынцыпаў і прыярытэтаў прафілактычнай дзейнасці. У рамках канцэпцыі вызначаны дакладныя меры на кароткатэрміновую перспектыву.*

Тым не менш, як сведчыць статыстыка, у параўнанні з такім жа перыядам летась, колькасць пацярпелых і няшчасных выпадкаў павялічылася. І тут важна памятаць, што электра- і цеплабяспека — абавязак не толькі спецыялістаў галіны энергетыкі, але і кожнага з нас. Веданне асноўных правіл бяспекі і карыстання электрычнасцю і газам у побыце — неад'емная частка агульнай культуры і грамадзянскай адказнасці, незалежна ад адукацыі і прафесіі чалавека.

### КАЛІ ВЫ ПАЧУЛІ ПАХ ГАЗУ

- Закрыйце кран падачы газу!
- Адчыніце вокны і дзверы для праветрывання!
- Не запальвайце святло і агонь, не карыстайцеся электрапрыладамі, нават тэлефонам!
- Выклічце газавую службу (з незагазаванага памяшкання!) па нумары 104.

### СМЯРОТНАЯ РЫБАЛКА

Сёлета сур'ёзна выраслі лічбы электратраўматызму, прычым асабліва непакоіць энергетыкаў лічба няшчасных выпадкаў сярод непаўналетніх. Несанкцыянаванае пранікненне на энергааб'екты (трансфарматарныя падстанцыі, паветраныя лініі электраперадачы, размеркавальныя шчыты) праз цікаўнасць ці гарэзлівасць; дакрананне да токавядучых частак няспраўнага абсталявання; рыбалка ў месцах перасячэння паветраных ліній электраперадачы з вадаёмамі; адсутнасць кантролю з боку дарослых — асноўныя прычыны няшчасцяў. Найбольш траўматычны перыяд — лета, асабліва жнівень, расказаў **Аляксандр ГУЛЕВІЧ, намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер установы «Дзяржаўны энергетычны і газавы нагляд»:**

*— Яшчэ адзін від няшчасных выпадкаў — электратраўматызм падчас рыбнай лоўлі. Падобныя здарэнні фіксуюцца ў краіне штогод, пачынаючы з 2011-га. Мы звязваем гэта са з'яўленнем вугляпластыкавых вудаў, выробленых з матэрыялаў, якія добра праводзяць электрычны ток (ранейшыя вуды са шклапластыку былі добрымі ізалятарамі і ток не праводзілі). З таго часу здарыўся 41 няшчасны выпадак, пры гэтым 30 рыбакоў загінула, а сярод пацярпелых — пяцёра непаўналетніх.*

Два няшчасці з рыбакамі здарыліся і сёлета. 28 мая ў Пінскім раёне мужчына ад паражэння токам загінуў у ахоўнай зоне паветранай лініі электраперадачы напружаннем 110 кВ, літаральна побач з забараняльным знакам. Паколькі з рыбакамі дамовіцца не ўдаецца, спецыялісты Мінэнерга ў месцах перасячэння з вадаёмамі паветраных ліній, якія знаходзяцца на балансе энергазабяспечвальных арганізацый, так званыя голыя правады мяняюць на ізаляваныя, дакрананне да якіх бяспечнае. Сёлета энергетыкі плануюць завяршыць гэту работу ва ўсіх выяўленых месцах (нават на тэрыторыях паводкі), аднак зрабіць гэта можна толькі на лініях напружаннем 0,4—10 кВ. Там, дзе ток большай магутнасці, так не зробіш.

Асноўныя прычыны электратраўматызму сярод дарослых акрамя рыбалкі ў забароненых месцах — парушэнне тэхнікі бяспекі падчас выканання работ у электраўстаноўках і выкарыстанне няспраўных ці самаробных падаўжальнікаў.



Да 30—40 % электратраўм можна было пазбегнуць, калі б у электрасетцы прысутнічала прылада ахоўнага адключэння, перакананы Аляксандр Гулевіч:

*— Усталяваныя ў дамах і кватэрах засцерагальнікі або аўтаматычныя выключальнікі забяспечваюць абарону электраабсталявання ад кароткіх замыканняў і перагрузак. Аднак у якасці абароны чалавека ад дакранання да токавядучых частак ці корпуса няспраўнага абсталявання пад напружаннем яны малаэфектыўныя. Абараніць ад няшчасных выпадкаў пры такіх дакрананнях можа прылада ахоўнага адключэння ці дыферэнцыяльны аўтаматычны выключальнік. Цяпер вырабляюць нават разеткі з убудаванай у іх прыладай ахоўнага адключэння.*

### КАЛІ Ў КВАТЭРЫ ГАЗ...

У жыллі беларусаў выкарыстоўваецца звыш 3,6 мільёна бытавых газавых пліт, каля 720 тысяч ацяпляльных газавых катлоў і 215 тысяч газавых воданагравальнікаў. У якасці прафілактычных мерапрыемстваў па ўтрыманні ў рабочым стане газавага абсталявання дзейнічае сістэма тэхнічнага абслугоўвання, у памяшканнях устанаўліваюцца сігналізатары і кантролеры канцэнтрацыі метану і чаднага газу, падзяліўся **Мікалай СТРУЦКІ, намеснік начальніка ўпраўлення сістэм газазабеспячэння аб'яднання «Белпалівагаз»:**

*— Газ, які выкарыстоўваецца ў побыце, — пажаранебяспечны, а ў сумесі з паветрам у пэўных прапорцыях — яшчэ і выбухованебяспечны. Уцечка газу і неасцярожнае абыходжанне з крыніцамі адкрытага агню могуць прывесці да пажару ці выбуху. Небяспечныя таксама і таксічныя прадукты няпоўнага згарання газу, найперш чадны газ, які ўтвараецца пры парушэнні рэжымаў гарэння і дымаадвядзення ў катлах і калонках.*

Спецыяліст дадаў, што спажыўцы часта самі бяспечна ставяцца да свайго газавага абсталявання: эксплуатуюць састарэлыя прылады, ігнаруюць лістоўкі з часам прыходу газавікоў на абследаванне. Летась з-за невытрымлівання правіл карыстання газам у побыце адбылося 11 здарэнняў: пяць пажараў, тры атручванні прадуктамі згарання, тры ўзрывы. Сёлета здарыліся тры няшчасці: два выпадкі атручвання чадным газам (у Мінску і Бабруйску), падчас якіх пацярпелі сем чалавек (двое з іх памерлі)...

*— За восем месяцаў газавікі замянілі каля 93 тысяч адзінак састарэлага газавага абсталявання. Летась было адключана 3200 адзінак газавага абсталявання з-за няспраўнасці дымавых і вентканалаў або адсутнасці адпаведных актаў праверкі (гэта 20 % ад агульнай колькасці адключанага абсталявання). Сёлета з гэтай прычыны адключылі ўжо 1400 адзінак.*

У школах спецыялісты ладзяць лекцыі па электрабяспецы, а ў краіне функцыянуе больш за 30 класаў па электрабяспецы: тры з якіх на базе філіялаў Дзяржэнергагазнагляду, астатнія — ва ўстановах адукацыі. Распрацаваны прафілактычныя гульні для мабільнікаў, планшэтаў і камп'ютараў, а спасылкі на іх ёсць на афіцыйным сайце https://gosenergogaznadzor.by/. Распрацавана і праграмнае забеспячэнне з прымяненнем тэхналогій віртуальнай рэальнасці «Бяспечны дом». Задача гэтага трэнажора — навучыць асноўным правілам электрабяспекі і бяспечнага выкарыстання газу ў кватэры. Ведамствам распрацаваны 13 відэа- і 5 аўдыяролікаў сацыяльнай рэкламы па розных тэматыках электра- і газавай бяспекі.

**Ірына СІДАРОК.**

### ПРАВІЛЫ ЭЛЕКТРАБЯСПЕКІ



- Ніколі не кранайце электрапрылады мокрымі рукамі!
- Карыстайцеся прыладамі толькі заводскага вырабу!
- Перад абслугоўваннем ці рамонтам электрапрылад упэўніцеся, што яны адключаны ад электрасеткі!
- Не рамантуйце электраправодку самастойна, калі не маеце неабходных навыкаў і ведаў!
- Перад выкарыстаннем электрапрылады вывучыце інструкцыю па яе прымяненні і вытрымлівайце рэкамендацыі!
- Памятайце, што электрычнасць небяспечная не толькі пры прамым кантакце, але і на адлегласці! У высакавольтных устаноўках, калі провад падае на зямлю, набліжэнне бліжэй за восем метраў да эпіцэнтра (кропкі судакранання з зямлёй) прывядзе да ўзнікнення электрычнай дугі і чалавек атрымае моцны ўдар токам.
- Падчас навальніцы заўжды ёсць верагоднасць, што маланка трапіць у дом, таму ў ім лепш адключаць на гэты час электрапрылады.

# Памылкі, якія робіць наш мозг

## Ці можна іх выправіць?



**Сярод распаўсюджаных ментальных пастак называюць упартасць (калі мы працягваем рабіць тое, што страціла для нас каштоўнасць), пракрастынацыю (адкладванне рашэння любых задач на апошні момант) і яе супрацьлегласць — апярэджанне (пачынаем занадта рана). Калі казаць проста, ментальныя пасткі — нашы няправільныя дзеянні і ўчынкі, якія часам засноўваюцца на памылках, няслушных уяўленнях і прыводзяць да страты часу. Пры гэтым мы абсалютна ўпэўненыя, што ўсё робім правільна.**

**Адной з такіх пастак можна назваць «ілюзію ведання» або «эфект шафёра». Што яна з сябе ўяўляе і як анекдатычна атрымала сваю назву? Чым небяспечная для нас саміх і грамадства? Як вызначыць, «шафёр» перад вамі ці сапраўдны прафесіянал? І як кожнаму з нас пазбавіцца «шафёрскага» мыслення? Пра гэта расказвае нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гумен ГАРБАННІДЖАД.**

***— «Эфект шафёра» лічыцца адной з распаўсюджаных ментальных пастак. Чаму?***

— З дзяцінства нас вучаць, што чалавек — самая дасканалая істота, вянец прыроды. Але гэта няправільна. Калі б нам з дзяцінства казалі, што чалавек — недасканалы, мае вялікую колькасць недахопаў і мусіць увесь час працаваць над сабой, больш сумняваўся, то мы б больш думалі.

Чалавек недасканалы ва ўсім. Калі б інжынер будаваў наша цела, то зрабіў бы яго больш трывалым, каб мы не ламалі канечнасці, калі падаем з вышыні свайго росту. Зрабіў бы гартань больш доўгай, каб мы не задыхаліся, калі п'ём ці ядзім. У нашым целе шматлікія фізіялагічныя недахопы, мы — недасканалыя. І адна з недасканаласцяў — наш галаўны мозг. Ён робіць шмат памылак і скажэнняў у паняццях і высновах. Самае простае скажэнне — міраж, калі мы бачым ваду замест пяску.



Адна з памылак, якую робіць наш галаўны мозг, калі ён не натрэніраваны, — нам важна не што, а хто гаворыць. Калі нешта кажа чалавек, які нам сімпатычны, падыходзіць нашаму мысленню, то мы лепш яго ўспрымаем. Калі тое ж самае скажа чалавек, якога мы не ўспрымаем ці лічым сваім ворагам, то мы не будзем давяраць яго словам.

Яшчэ адзін прыклад скажэння. Калі адзін малады чалавек спытаў у святара, ці можна падчас малітвы курыць, той адказаў, што нельга, бо гэта вялікі грэх. А другі тады спытаў па-іншаму: «Калі я куру, ці магу я маліцца?» Канешне, адказаў святар. «Чым больш ты будзеш маліцца, тым больш бог будзе ўспамінаць пра цябе». Па сутнасці, адно і тое ж пытанне, — адказы супрацьлеглыя.

***— Давайце вернемся да «ілюзіі ведання». Адкуль пайшла назва «эфект шафёра»?***

— Калі фізік Макс Планк атрымаў Нобелеўскую прэмію за адкрыццё квантавай механікі, ён доўгі час ездзіў па еўрапейскіх універсітэтах з лекцыямі — тлумачыў сваё рэвалюцыйнае адкрыццё. Кожны раз яго суправаджаў адзін і той жа шафёр, які потым жартам сказаў, што ён ужо столькі разоў чуў гэтую лекцыю, што мог бы і сам яе прачытаць. На што Макс Планк імгненна пагадзіўся.

У наступным універсітэце шафёр правёў лекцыю, і, паколькі ў 1919 годзе людзі не ведалі, як выглядае сапраўдны Макс Планк, ніхто не заўважыў падмены. Больш за тое, шафёр упэўнена адказаў на ўсе стандартныя пытанні з аўдыторыі, бо адказы на іх ён таксама ўжо шмат разоў чуў. І толькі на незвычайнае пытанне ад спецыяліста шафёр сказаў: «Ну, гэта такое простае пытанне, што нават мой шафёр можа на яго адказаць» і паказаў на Макса Планка, які стаяў побач.

Гэты рэальны выпадак, падобны на анекдот, тым не менш, з'яўляецца прыкладам фундаментальнай з'явы, надзвычай распаўсюджанай у групах людзей, якія фарміруюцца па якім-небудзь прафесійным прынцыпе, — напрыклад, навукоўцаў, урачоў, палітыкаў ці інвестараў. Гэты эфект існаваў даўно і шырока выкарыстоўваўся ў палітыцы і іншых мэтах.

***— У чым яго сутнасць?***

— Толькі нямногія людзі з'яўляюцца сапраўды прафесіяналамі (Максамі Планкамі), якія стаяць на перадавых пазіцыях у сваёй галіне. Нашмат больш шафёраў-імітатараў. Яны вывучваюць ролю і адказы на стандартныя пытанні. Яны атрымліваюць аўтарытэтныя вучоныя ступені або іншыя сведчанні сваёй прафесійнай значнасці. Яны даводзяць да дасканаласці свой упэўнены вонкавы выгляд, яны спакойныя, іх прамова пераканаўчая. Вонкава яны абсалютна неадрозныя ад Максаў Планкаў. Але яны застаюцца імітатарамі — у нестандартных сітуацыях, дзе неабходная экспертыза прафесіяналаў, яны бескарысныя.

Прычым няважна, з якім узроўнем адукацыі чалавек, якую пасаду займае, ён мае такія скажэнні, і гэта нясе глабальны ўрон нашаму грамадству, жыццю і мысленню. Многія людзі, няважна, з якой сферы — медыцыны, эканомікі, рэлігіі, кіравання, культуры, — крыху «шафёры». Мы з імі сутыкаемся кожны дзень і самі часам з'яўляемся крыху «шафёрамі». І чым больш мы «шафёры», тым больш можам уплываць на іншых.

Калі ўзяць трох чалавек, адзін з якіх увогуле непрафесіянал, другі — студэнт, трэці — прафесар, якія будуць прэтэндаваць на пасаду кіраўніка прадпрыемства, а рабочыя мусяць галасаваць, то выберуць хутчэй за ўсё непрафесіянала, бо ён з'яўляецца вялікім «шафёрам». Ён не ведае законаў эканомікі, тонкасцяў вытворчасці і продажаў, але ён шмат абяцае — падняць завод на іншы ўзровень, рост зарплат, выпуск новай прадукцыі.

Студэнт, зыходзячы з тых невялікіх ведаў, якімі валодае, скажа: магчыма, будзем гэта выпускаць, а магчыма, і не атрымаецца, магчыма, выйдзем на іншы ўзровень, але не факт. А вось прафесар скажа, што спачатку трэба знізіць зарплаты і звольніць частку работнікаў, пасля гэтага выйдзем на прыбытковасць...

Ён намаляваў максімальна рэальную карціну будучыні гэтага завода і нікога не падмануў, але, на жаль, галасоў не набраў. У выніку выберуць непрафесіянала, завод абанкруціцца, усе застануцца без работы, але часам выбіраюць менавіта так. Таму эфект «шафёра» дастаткова разбуральны.

Многія ўрачы з-за сваіх шаблонных ведаў, паслухаўшы рэкламу фармакалагічнай кампаніі, пачынаюць прызначаць нейкія лекі, не паглыбляючыся, якія ўскладненні можа гэта выклікаць, у выніку рызыкуюць нашкодзіць пацыенту. Палітык, які глыбока не ўнікае, а ведае праблемы павярхоўна, можа праводзіць палітыку, якая прывядзе да войнаў ці краху эканомікі. «Шафёры» бачаць толькі верхавіну айсберга, а каб убачыць яго ніжнюю частку, патрэбна паглыбленне ў праблему.

***— Ці ёсць прыклады ў гісторыі, калі гэта ментальная пастка выкарыстоўвалася і мяняла ход падзей?***

— «Эфект шафёра» выкарыстоўваў яшчэ Чынгісхан. Ён адрозніваўся тым, што ўмеў акружыць сябе мудрымі людзьмі. Яго дарадчык Елуй Чуцай вядомы сваёй фразай: «Імперыя захоплівается на кані і з мячом, але кіруецца не на кані і не мячом». Калі Чынгісхан захапіў Персію, спытаў дарадчыкаў, як ёй кіраваць, бо акупаваная тэрыторыя была нашмат больш развітай. Адзін з дарадцаў прапанаваў прызначыць у кіраванне не самых разумных людзей, аргументаваўшы, што пры такім становішчы спраў яны збяруць вакол сябе такіх жа людзей, як самі, пры гэтым разумныя разбягуцца. А Чынгісхану такія людзі не здрадзяць, бо будуць адчуваць сябе абавязанымі, і імперыя сама разваліцца. Гэта паказвае, наколькі эфект «шафёра» знішчальны для кіравання.

> **«Адна з памылак, якую робіць наш галаўны мозг, калі ён не натрэніраваны, — нам важна не што, а хто гаворыць. Калі нешта кажа чалавек, які нам сімпатычны, падыходзіць нашаму мысленню, то мы лепш яго ўспрымаем. Калі тое ж самае скажа чалавек, якога мы не ўспрымаем ці лічым сваім ворагам, то мы не будзем давяраць яго словам».**

Ім у каланіяльную эпоху карысталіся англасаксы. Каб менш траціць на войска, яны выкарыстоўвалі такія методыкі. Таксама «шафёраў» прызначалі ці ўкаранялі на высокія пасады, сабе падобных яны збіралі ў кіраўніцтве, прафесіяналы з-за гэтага сыходзілі. У выніку краіна развальвалася сама па сабе. Таму многія сацыёлагі лічаць, што «эфект шафёра» — вельмі небяспечная пастка для самога чалавека і для развіцця грамадства. Глабальныя рашэнні ў палітыцы, эканоміцы, медыцыне, рэлігіі, навуцы, культуры, адукацыі прымаюцца «шафёрамі», якія не валодаюць глабальнымі ведамі.

***— Як вызначыць, «шафёры»-імітатары ці рэальныя спецыялісты кіруюць галіной ці прадпрыемствам?***

— Калі мы бачым вялікую колькасць эканамістаў высокага рангу, але ў гэтай краіне эканоміка не развітая, то большасць з іх відавочна «шафёры». Тое ж самае, калі шмат спецыялістаў у галіне медыцыны, але медыцына на нізкім узроўні ці вялікая колькасць ваенных з высокімі званнямі, але войска слабае, гэта сведчыць, што колькасць «шафёраў» пераважае над сапраўднымі спецыялістамі.

Трэба сказаць, што, калі ў свеце ідзе працэс глабалізацыі, каб змякчыць яе ўздзеянне і цвёрда стаяць на сваіх нагах, кожнай краіне трэба імкнуцца назапасіць больш сапраўдных спецыялістаў, а не «шафёраў».

***— А ў чым небяспека «эфекту шафёра» для кожнага з нас?***

— Кожны чалавек, няважна, якую навуковую ступень ён мае ці якім узроўнем ведаў валодае, час ад часу паддаецца ілюзіі, што цалкам разабраўся ў сітуацыі і знайшоў выйсце. Насамрэч ён можа памыляцца і бачыць толькі верхавіну.

Таму варта прызнаць, што мы недасканалыя і памятаць, што часам з'яўляемся «шафёрамі» — хтосьці больш, хтосьці менш. І кожны раз, калі збіраемся рабіць нейкія высновы, добра падумаць, каб не трапіць у пастку «ілюзіі ведання».

Небяспека псіхалогіі «шафёра» яшчэ і ў тым, што калі ён сутыкаецца з сапраўдным прафесіяналам, які імкнецца яму нешта растлумачыць ці даказаць фактамі, «шафёр» заўсёды хоча такога спецыяліста звольніць, выгнаць, знішчыць, бо іх ідэі і меркаванні не супадаюць. Таму мы павінны больш сумнявацца, больш слухаць і ўспрымаць іншыя меркаванні, разважаць. Калі ж мы самаўпэўненыя, то не ўспрымаем новыя веды, іншыя меркаванні і, нарэшце, свет, які мяняецца. Такая псіхалогія «шафёра».

***— Ці можна гэты дэфект неяк выправіць?***

— Каб наш галаўны мозг мог гэта зрабіць і выйсці на новы ўзровень, патрэбна сутыкненне двух супрацьлеглых меркаванняў — іх называюць тэза і антытэза. У выніку атрымліваецца новае меркаванне, якое называюць сінтэзам. Калі мы кажам: «Я так думаю, і кропка», да чаго гэта прывядзе? Сутыкнення меркаванняў не адбудзецца і не з'явіцца сінтэз.

Зыходзячы з таго, што з часам нашы ўласныя веды павялічваюцца і чалавечыя пазнанні растуць, сінтэз зноўператвараецца ў тэзу, якая ў сваю чаргу сутыкаецца з антытэзай, што стварае новы сінтэз. Гэта тое, што мы называем спіралепадобным развіццём грамадства. «Шафёрскае» мысленне затармажвае сутыкненне тэзы і антытэзы для з'яўлення новых ідэй. Недарэмна кажуць, што заўсёды варта слухаць свайго ворага, бо ён скажа тое, чаго не гаворыць наш сябар.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Аляксандр ЯКІМЕНКА:**

# «Нам яшчэ трэба знайсці сваю разыначку. А яна ёсць і дапаможа абыгрываць найлепшыя каманды свету»

СЁЛЕТА беларускаму хакею на траве спаўняецца 45 гадоў. У 1978-м Савецкі Саюз актыўна рыхтаваўся да Алімпійскіх гульняў, якія ў 1980-м прымала Масква, і спартыўнае кіраўніцтва СССР хацела выставіць на хатнюю Алімпіяду моцныя каманды, у тым ліку — па хакеі на траве. У той час гэты від спорту яшчэ не меў такіх багатых традыцый і моцных школ, як іншыя гульнявыя віды. Таму ўсе саюзныя рэспублікі рынуліся развіваць хакей на траве. Асновай былі, як не складана здагадацца, прадстаўнікі хакея на лёдзе і рускага хакея. У Беларусі першымі памянялі лёд на траву гомельскія хакеісты. У Гомелі раскрыўся талент Аляксандра Якіменкі, цяперашняга старшыні Беларускай федэрацыі хакея на траве. Гэты від спорту развіваўся на яго вачах і пры яго непасрэдным удзеле. Яны разам мацнелі і дабіваліся поспехаў. За 45 гадоў хакей на траве прарабіў каласальны шлях, а яго сям'я папоўнілася новымі відамі — індархакеем і Hockey5s. І сёння «летні хакей» з упэўненасцю глядзіць наперад. Пра мінулае, сучаснасць і будучыню беларускага хакея на траве Аляксандр Якіменка распавёў у інтэрв'ю «Звяздзе».



***— Аляксандр Леанідавіч, напэўна, не памылюся, калі выкажу здагадку, што вы свой спартыўны шлях пачыналі з хакея на лёдзе.***

— Не памыліцеся. Я як тыповае савецкае дзіця з першага класа займаўся хакеем з шайбай у Генадзя Барысавіча Аляхновіча. У 16 гадоў я ўжо гуляў за каманду майстроў «Экран». У 1982 годзе першы раз узяў у рукі клюшку для хакея на траве. Набліжалася Спартакіяда народаў СССР, і каманду па хакеі на траве збіралі з «традыцыйных хакеістаў». Новы хакей мне спадабаўся не менш за стары. І досыць працяглы час раніцай я хадзіў на трэніроўку па хакеі з шайбай, увечары — па хакеі на траве. У перапынку паміж трэніроўкамі вучыўся.

***— Што стала вырашальным у вашым выбары на карысць хакея на траве?***

— Від спорту толькі развіваўся, канкурэнцыя сярод гульцоў была значна ніжэйшая, адкрываліся вялікія перспектывы. Для спартсмена што галоўнае? Правільна, спаборніцтвы. У той час праводзілася шмат турніраў па хакеі на траве, праходзілі нават асобныя чэмпіянаты СССР сярод гульцоў пэўнага ўзросту. Наша гомельская каманда «Лакаматыў» была базай для зборнай БССР, і я зразумеў, што хакей на траве адкрывае мне больш перспектыў. Мы актыўна выступалі на Спартакіядах народаў СССР, шматлікіх турнірах. У 1985 годзе наша зборная выйграла чэмпіянат СССР сярод гульцоў 1967 года нараджэння. Калі мне было 18 гадоў, я атрымаў запрашэнне выступаць за каманду СКА-Свярдлоўск, адну з наймацнейшых у Савецкім Саюзе. Да таго ж у Свярдлоўску я мог гуляць у хакей і служыць у арміі. У мяне ўжо быў набыты білет, але трэнер Уладзімір Жмакін пераканаў мяне застацца ў Мінску, тут патрэбны былі моцныя гульцы. Я пераехаў у Мінск, стаў гуляць за «Буравеснік». Наша каманда вельмі годна выступала. Мы нават даходзілі да фіналу Кубка СССР, дзе сустрэліся са СКА-Свярдлоўск. Мы, на жаль, прайгралі, але, тым не менш, дайшлі да фіналу, дзе сустрэліся з моцным сапернікам. Магчыма, калі б я паехаў у Свярдлоўск, то ўвайшоў бы ў зборную СССР, выступаў на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах свету. Але і без гэтага я ўваходзіў у зборную СССР, быў на заключным зборы перад Алімпійскімі гульнямі 1992 года. У Барселону не паехаў не з прычыны спартыўнага майстэрства. Аднак тое, што я гуляў у складзе зборнай СССР, лічу сваім вялікім дасягненнем. У дзяцінстве маімі кумірамі былі браты Плешаковы, зоркі савецкага хакея на траве. Яны прыязджалі да нас на зборы, і кожны марыў стаць такім жа спартсменам. А праз 10 гадоў я гуляў з імі ў адной камандзе і па-вар'яцку ганарыўся, што дайшоў да ўзроўню майстэрства сваіх куміраў.

***— Як вядома, у часы перабудовы і наступнага развалу Савецкага саюза спорту было вельмі несалодка. Як гэты складаны перыяд перажываў хакей на траве?***

— Многія гульцы пайшлі на рынак прадаваць машыны, таму што трэба было за нешта жыць. Сярэдні заробак складаў 12 долараў. Як хакей на траве выжыў — незразумела. Думаю, уся справа ў любові да гэтага віду спорту і энтузіязму, які кіпеў у трэнерах і спартсменах. Толькі дзякуючы гэтаму мы пераадолелі ўсе цяжкасці і нават прымнажылі свае поспехі. Далёка не ўсім постсавецкім краінам гэта ўдалося, нават тым, у каго традыцыі ў хакеі на траве нашмат багацейшыя. Я ўдзячны людзям, якія нас вучылі, якія стваралі і развівалі гэты спорт. І гэта не прыгожыя словы. У 1992 годзе, пасля распаду СССР, наша зборная выйграла ў Маскве турнір за права прадстаўляць СССР ва ўсіх спаборніцтвах пад эгідай міжнароднай і Еўрапейскай федэрацый па хакеі на траве. У 1994 годзе ў Аўстраліі мы выступалі на Кубку свету, дзе занялі 1 месца. А ў 1997 годзе каманда Мінска заняла чацвёртае месца ў розыгрышы Кубка ўладальнікаў Кубкаў еўрапейскіх краін. Менш як за 20 гадоў развіцця хакея на траве мы дайшлі да такіх поспехаў. Гэта сапраўды дарагога варта.

**«Я шчаслівы, што ёсць людзі, якія дапамагаюць нашаму любімаму віду спорту жыць і развівацца. Я буду толькі рады, калі будуць прыходзіць людзі з новымі ідэямі. Спадзяюся, што хакею на траве не нашкодзіў, а дапамог у яго развіцці. Сёння ў кожным рэгіёне ёсць стадыёны, у нас няма праблем з інвентаром. Вядома, калі б нашы папярэднікі не ўзяліся развіваць малавядомы від спорту, нічога б гэтага не было».**

***— У чым сакрэт?***

— З намі працавалі трэнеры, горача ўлюбёныя ў свой від спорту. Уладзімір Жмакін, Генадзь Аляхновіч, Валерый Клімовіч, Канстанцін Карыцкі, Аркадзь Лябедка і многія іншыя — усе прафесіяналы і фанаты сваёй справы. Характар і талент кожнага спартсмена — заслуга яго трэнера, асабліва першага. Калі б Генадзь Аляхновіч не заклаў патрэбныя якасці, у мяне не было б ні спартыўных, ні адміністрацыйных дасягненняў. Таму я вельмі ўдзячны ўсім трэнерам, якія са мной працавалі. І не стамляюся ўсім паўтараць, што любое дзіця ідзе на трэнера. Менавіта трэнер спачатку павінен зацікавіць гэтым відам спорту, а затым ужо выхаваць прафесіянала.

***— Напэўна, такі падыход вам дапамагаў, калі вы былі трэнерам?***

— Так, але я быў дзяржаўным трэнерам, а гэта больш адміністрацыйная праца. Я стаў дзяржаўным трэнерам у 1996 годзе, вельмі складаным для хакея на траве: былі закрыты дзіцячыя школы, стадыёнаў было вельмі мала. Вялікае шчасце, што на хакей на траве звярнуў увагу Прэзідэнт, ён даў даручэнне адрадзіць яго. Зноў пачалі адкрывацца аддзяленні ў дзіцяча-юнацкіх спартыўных школах, быў адроджаны хакей у Гомелі, пабудавалі стадыёны ў Гомелі, Оршы, рэканструяваны палі ў Гродне і Брэсце. У 2003 годзе было адкрыта знакамітае поле ў мінскім парку Горкага. Яго адкрываў асабіста Прэзідэнт, і на адкрыцці мы ўручылі яму клюшку як сімвал адраджэння гэтага віду спорту. Сёння заняткі хакеем на траве бясплатныя, што, вядома, прываблівае дзяцей. Засталіся ў мінулым праблемы з інвентаром. Нават цяпер, калі мы адхіленыя ад міжнародных стартаў, атрымалі ад міжнароднай федэрацыі 400 клюшак і 13 камплектаў варатарскай формы для дзіцячых школ. У нас у цэлым былі выдатныя адносіны з кіраўніцтвам міжнароднай федэрацыі, мы не раз атрымлівалі гранты. Яны бачаць, колькі дзяцей у нас займаецца — толькі ў сістэме дзіцяча-юнацкага спорту 1,5 тысячы. І мы бяром не колькасцю, а якасцю. У 2020 годзе хакейны клуб «Мінск» заваяваў «бронзу» Кубка клубных каманд Еўропы. У 2019 годзе нашы дзяўчаты выступалі ў фінале чэмпіянату Еўропы па хакеі на траве, куды адбіраюцца восем наймацнейшых каманд кантынента. У Еўропе 44 краіны развіваюць хакей на траве, і мы былі ў васьмёрцы наймацнейшых. Пазіцый не здаём і зараз, упэўнена ідзём да сваіх мэт.

***— І якія ж яны?***

— Як і ўсіх людзей спорту — выступіць на Алімпійскіх гульнях. Я разумею, што жаночай зборнай гэта больш рэальна, чым мужчынскай. Цяпер наша жаночая зборная займае 20-е месца, на Алімпійскіх гульнях выступае 12 каманд. За год-два гэта ўсё не вырашаецца, але пры нармальнай сістэме праз пэўны час мы маем шанц на алімпійскую пуцёўку. Нам трэба стварыць сваю сістэму: удасканаліць існуючую, узяць нешта ад замежных калег, і мы атрымаем свой высокі вынік. Беларускія хакеісты вельмі ўпартыя, нашы каманды вельмі згуртаваныя. Але я думаю, што нам яшчэ трэба знайсці сваю разыначку. А яна ёсць, і дапаможа абыгрываць найлепшыя каманды свету.

***— Аляксандр Леанідавіч, нараўне з хакеем на траве паспяхова развіваецца яго «малодшы брат» індархакей. Якія перспектывы гэтага віду вы бачыце?***

— Гэта не малодшы брат, а паўнавартасны від спорту, які развіваецца ў нас з сярэдзіны 1980-х гадоў. У 1985 годзе гродзенская каманда «Рытм» прымала ў «Стайках» Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў дывізіёна В. Гэта было першае спаборніцтва па індархакеі, якое прайшло ў Беларусі. З 1999 года нашы дзяўчаты пяць разоў станавіліся чэмпіёнкамі Еўропы да 21 года. Восем гадоў з жаночай зборнай працаваў галандскі спецыяліст Круіс Херман, які даў штуршок не толькі жаночай зборнай, але і ўсяму беларускаму хакею на траве, навучыў трэнераў і спартсменаў думаць, тварыць і дзейнічаць.

***— І як жа забыцца тую перамогу нашай жаночай зборнай на чэмпіянаце Еўропы 2020 года...***

— Гэта сапраўды было неверагодна. На хатнім чэмпіянаце Еўропы абыграць грандаў сусветнага індархакея немак і галандак — гэта фантастыка. За перамогай стаяла велізарная праца ўсяго калектыву, усіх трэнераў, лекараў. Тая перамога і збоку выглядала вельмі прыгожа. Але калі бачыш, якая праца стаіць за ёй і ведаеш, чаго варта было прыйсці да перамогі, то эмоцыі немагчыма выказаць словамі. На ўсіх міжнародных кангрэсах Беларусь прыводзілі ў прыклад як краіну, здольную дабівацца высокіх вынікаў і якая пры гэтым не мае вялікай колькасці тых, хто займаецца. І тая перамога ў 2020 годзе паказала, што не ўсё вырашаюць грошы. У нямецкай і галандскай федэрацый хакея на траве бюджэты значна большыя, чым у нас. Але залатыя медалі былі ў беларускіх дзяўчат. І гэта, вядома, дало штуршок у развіцці нашага спорту. У 2018 годзе мы з шасці школ не маглі набраць 10 класных перспектыўных ігракоў. А цяпер у нас па кожным узросце самавітая лаўка запасных, мінімум па 25 моцных гульцоў.

***— У жніўні ў рамках II Гульняў краін у Гродне прайшлі спаборніцтвы па новай праграме хакея на траве Hockey5s, беларускія спартсмены сталі пераможцамі. Наколькі перспектыўным вам бачыцца гэты від хакея?***

— Ён сапраўды перспектыўны, дынамічны і сучасны. Перавага Hockey5s у тым, што яго могуць развіваць краіны, якія не маюць магчымасцяў для вялікага хакея на траве ці індархакея, бо ў каманду трэба ўсяго 10 чалавек. Гэта відовішчны, цікавы від, у якога вялікая будучыня.

***— Аляксандр Леанідавіч, як асабіста вам быць на чале вялікай сям'і хакея на траве?***

— Я шчаслівы, што ёсць людзі, якія дапамагаюць нашаму любімаму віду спорту жыць і развівацца. Я буду толькі рады, калі будуць прыходзіць людзі з новымі ідэямі. Спадзяюся, што хакею на траве не нашкодзіў, а дапамог у яго развіцці. Сёння ў кожным рэгіёне ёсць стадыёны, у нас няма праблем з інвентаром. Вядома, калі б нашы папярэднікі не ўзяліся развіваць малавядомы від спорту, нічога б гэтага не было. Яны стварылі нам вельмі моцны падмурак, на якім сёння камфортна працаваць. Спадзяюся, наша цяперашняя дзейнасць гэтак жа будзе ў дапамогу наступным пакаленням. Мы стараемся з кожнай паразы рабіць высновы і працягваем тварыць і імкнуцца наперад. З 45-гадовай гісторыі хакея на траве я правёў у гэтым спорце 42 гады. І мне не сорамна за іх.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Логойского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

- **ресторан «Партизанский бор» с инв. № 601/С-13341 общей площадью 773,2 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623280804601000027** *(право постоянного пользования)* **площадью 0,9000 га по адресу: Минская область, Логойский район, М-3, 53 км, 5,** *часть зем. участка (0,4935 га) расположена в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильных дорог*;
- **здание гостиничного домика с инв. № 601/С-33621 общей площадью 156,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623280406102000001** *(право постоянного пользования)* **площадью 0,1000 га по адресу: Минская область, Логойский район, М-3, 53 км, 3;**
- **здание бани с инв. № 601/С-33622 общей площадью 48 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623280406102000001** *(право постоянного пользования)* **площадью 0,1000 га по адресу: Минская область, Логойский район, М-3, 53 км, 3/1;**
- **здание высоковольтной КТП с инв. № 601/С-33620 общей площадью 43,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623280406102000002** *(право аренды по 17.10.2121)* **площадью 0,0090 га по адресу: Минская область, Логойский район, М-3, 53 км, 4,** *зем. участок расположен в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильных дорог, охранной зоне эл. сетей свыше 1000 вольт*;
- **артезианская скважина ВУ-7-65 с инв. № 601/С-33775, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 623280800001000013** *(право аренды по 16.01.2122)* **площадью 0,0900 га по адресу: Минская область, Логойский район, М-3, 53 км, 6,** *зем. участок расположен в зоне санитарной охраны скважины*.

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **2 900 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **290 000,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **27.10.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.10.2023** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (801774) 43 4 03; (8044) 748 86 18.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Компрессор СБ 4/с-100, инв. № 647** | 900,00 | 90,00 | 45,00 |

В отношении лота проводятся первые торги.

**Местонахождение лотов:** Минская обл., Минский р-н, пос. Боровляны, ул. 40 лет Победы, 19

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **31 октября 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 26 сентября 2023 года до 16.00 27 октября 2023 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ», проводимых 31.10.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр.лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявления с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375173515452, +375293396845, e-mail: pc-bel@tut.by (220090, г. Минск, улица Широкая, д. 4, УНП 600013209)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## Извещение о проведении 27 октября 2023 года публичных торгов № 01-ННО-23 по продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта

**Сведения о предмете аукциона**

| Местонахождение предмета аукциона | Кадастровый номер земельного участка | Площадь (га) | Вид права на земельный участок / срок аренды | Целевое назначение земельного участка / назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| г. Минск, ул. Казимировская, 12 | 500000000006011130 | 9,2770 | Право аренды на земельный участок / 5 лет | Для завершения строительства и обслуживания объекта «Спортивно-оздоровительный и торгово-развлекательный центр на пересечении ул. Казимировской – ул. Каменногорской в г. Минске»/ земельный участок для размещения объектов иного назначения | 121 073 360,52 (в том числе: начальная цена не завершенного строительством незаконсервированного объекта «Спортивно-оздоровительный и торгово-развлекательный центр на пересечении ул. Казимировской – ул. Каменногорской в г. Минске» в соответствии с оценочной стоимостью в размере 120 499 009,85 бел. руб., начальная цена права аренды земельного участка площадью 9,2770 га в размере 574 350,67 бел. руб. с учетом предоставления земельного участка сроком на 5 лет | 12 100 000,00 |

**Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома «О создании земельного участка для проведения аукциона» от 16.08.2023 № 3326 (далее – решение № 3326), и иные условия аукциона:**

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
- в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее 3 месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона, обратиться за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;
- в месячный срок с даты государственной регистрации прав и ограничений (обременений) прав на предоставленный земельный участок приступить к разработке проектной документации на строительство объекта. Срок ее разработки, с учетом положительной государственной экспертизы, не должен превышать 2 лет с даты государственной регистрации прав и ограничений (обременений) прав на предоставленный земельный участок;
- в течение месяца с момента получения положительного заключения государственной экспертизы утвердить проектную документацию на строительство объекта в установленном порядке;
- в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка);
- обеспечить пользование предоставленным земельным участком в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления, осуществлять комплекс мероприятий по охране земель, своевременно вносить арендную плату;
- не передавать земельный участок в пользование, аренду другим организациям и гражданам, не нарушать прав смежных землепользователей.

**Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона принять к сведению:**
- до осуществления победителем аукциона государственной регистрации возникновения прав на предоставленный земельный участок, земельный участок будет использоваться в городском хозяйстве г. Минска;
- расходы по оценке не завершенного строительством незаконсервированного объекта «Спортивно-оздоровительный и торгово-развлекательный центр на пересечении ул. Казимировской – ул. Каменногорской в г. Минске» составляют 46 248,00 бел.руб.;
- в случае отсутствия разработанной и утвержденной в установленный срок проектной документации, Мингорисполкомом будет инициирована процедура изъятия земельного участка;
- в случае не освоения земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения проектной документации Мингорисполкомом будет инициирована процедура изъятия земельного участка.

**Продавец предмета аукциона:** Минский городской исполнительный комитет, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 8, тел. + 375 (17) 317 16 66, +375 (17) 326 69 66.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. + 375 (17) 363-96-72.

Форма публичных торгов: открытый аукцион (на повышение начальной цены).

Предмет аукциона: не завершенный строительством незаконсервированный объект и право аренды земельного участка, необходимого для завершения строительства и обслуживания этого объекта, составляющие единый предмет аукциона.

Аукцион состоится **27 октября 2023 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7.

Прием заявлений на участие в аукционе и прилагаемых к ним документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2 **с 26 сентября 2023 г. по 25 октября 2023 г.** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам до 16.30). Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определен Положением о продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.05.2016 № 370 «О некоторых мерах по реализации Декрета Президента Республики Беларусь от 12 ноября 2015 г. № 8».

Участниками аукциона могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства), если иное не установлено законодательными актами. На стороне покупателя допускается участие консолидированных участников: двух и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц (далее – консолидированные участники).

**Порядок оформления участия в аукционе**

Организатору аукциона в указанный в извещении срок подается заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Задаток по соответствующему предмету аукциона перечисляется в срок, установленный для приема документов, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 01-ННО-23;

гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с переводом на белорусский или русский язык, верность которого или подлинность подписи переводчика которого должна быть засвидетельствована нотариально;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, документ, удостоверяющий личность, в случае, когда юридическое лицо представляет его руководитель, – документ, подтверждающий его полномочия;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность, документ, удостоверяющий личность;

представителем иностранного юридического лица, иной иностранной организации, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном порядке, с переводом на белорусский или русский язык, верность которого или подлинность подписи переводчика которого должна быть засвидетельствована нотариально, документ, удостоверяющий личность.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей, юридических лиц, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе, в случае, когда интересы консолидированных участников представляют иные лица.

К участию в аукционе допускаются лица, перечисленные в настоящем извещении, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение.

**Порядок определения победителя аукциона (единственного участника несостоявшегося аукциона)**

Аукцион начинается с объявления аукционистом порядка проведения аукциона, начальной цены предмета аукциона, его наименования, места нахождения и краткой характеристики не завершенного строительством незаконсервированного объекта, условий, с которыми продается данный предмет аукциона (в случае продажи на аукционе с условиями), шага аукциона. Шаг аукциона определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены предмета аукциона. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона от начальной цены предмета аукциона.

Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Если по объявленной аукционистом цене предмета аукциона аукционные номера подняли два участника аукциона и более, аукционист объявляет новую цену предмета аукциона в соответствии с шагом аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

**Сведения об обязанности победителя аукциона (единственного участника несостоявшегося аукциона):**

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов, в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона, либо признания аукциона несостоявшимся:

- внести плату за право аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Мингорисполкомом рассрочки ее внесения);
- возместить Мингорисполкому затраты на формирование земельного участка в размере 8 748,47 бел. руб.;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под подпись);
- выполнить условия, предусмотренные в решении № 3326, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения победителем аукциона (единственным участником несостоявшегося аукциона) указанных действий и представления организатору аукциона и в Мингорисполком копий платежных документов, **но не позднее двух рабочих дней**, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом (Мингорисполкомом) заключается договор купли-продажи не завершенного строительством незаконсервированного объекта и договор аренды земельного участка.

В тот же срок Мингорисполком передает победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) выписку из решения № 3326 и выдает экземпляр протокола.

**Дополнительная информация:** извещение о проведении аукциона опубликовано на сайтах: государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «Продажа /Аренда имущества»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Земля и имущество»/«Продажа /Аренда/в отношении земельных участков), организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Земельные участки» и «Недвижимость в собственность»).

Телефон для справок: **+375 (17) 363 96 72** (по вопросам проведения аукциона), **+375 (17) 317 16 66, +375 (17) 326 69 66** (по вопросам осмотра предмета аукциона).

З архіўных крыніц

# «ВЫКІНЬЦЕ РАМАН АДАМОВІЧА...»,

## альбо Лёс аднаго перавыдання



**Для чытача многія таямніцы ўнутрывыдавецкай палітыкі, планавання і падрыхтоўкі да выхаду кніг у большасці выпадкаў малавядомыя ці зусім невядомыя. Часам складваецца нават падманлівае меркаванне, што ў добра знаёмых нам раманаў вядомых аўтараў шчаслівы лёс.**

Возьмем, напрыклад, славутую «Партызанскую дылогію» Алеся Адамовіча...

У 1960 годзе маскоўскі часопіс «Дружба народов» надрукаваў раман беларускага празаіка «Вайна пад стрэхамі» («Война под крышами»). У тым жа годзе раман выходзіць асобным выданнем у Мінску. Праз тры гады — дылогія, ужо з другім раманам «Сыны сыходзяць у бой», прыходзіць да чытача адной кнігай, таксама ў Мінску. У Маскве другі раман выходзіць асобна — у 1963 і 1964 гадах. І яшчэ — у 1970 годзе. Пры гэтым «Партызанскую дылогію» знайсці на паліцах кнігарняў было даволі цяжка... Асабліва — беларускаму чытачу...

Некаторае святло на выдавецкі лёс папулярных і запатрабаваных чытачом твораў праліваюць тры дакументы, якія захоўваюцца сёння ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Сам пісьменнік звяртаецца ў Дзяржаўны камітэт па друку пры Савеце Міністраў БССР у студзені 1971 года... Працытуем гэты кароткі рукапісны зварот Алеся Міхайлавіча Адамовіча да старшыні камітэта Рыгора Канавалава:

*«Паважаны Рыгор Васільевіч!*

*Вам у Камітэт і ў выд-ва «Беларусь» прыходзяць паперы з дзіўна настойлівай рэкамендацыяй: «Выкіньце раман Адамовіча з плана 1972 г., паколькі ў 1972 г. ён выходзіць у Маскве.*

*Але Вам, відаць, невядома, што нехта (мяркуючы па хлусні — дробны клерк) ад імя маскоўскага Камітэта па справах друку пазваніў у выд-ва «Художественная литература» і «парэкамендаваў»: «Выкіньце з плана раман Адамовіча, паколькі ён выходзіць (падкрэслена аўтарам звароту —* **К. Л., В. С.***) у Мінску ў 1971 г.»*

*Вам пішуць, што ў Маскве — у 1972 г., маскоўскаму выдавецтву гавораць, што ў Мінску — у 1971 г., і ўсё дзеля таго, каб, заблытаўшыся, выкінулі і тыя і другія.*

*З маскоўскім не атрымалася: тыя разабраліся, там ужо карэктура. Цяпер усе намаганні — на Мінск.*

*Хто гэты дробны хлус, я не ведаю (ва ўсялякім выпадку не так ужо ўпэўнены, каб называць зараз), але што дробны і хлус — гэта відаць «па почырку». І дзейнічае ён — праз Маскоўскі Камітэт, хаця сам, зразумела, не адтуль.*

*У выд-ве «Художественная литература» раман ляжыць з 1966 г. і нарэшце выходзіць у 1971 г. (Леў Салавей таксама бачыў карэктуру)...»*

Кароткае адступленне. Леў Антонавіч Салавей (1925 — 1988) — беларускі перакладчык і крытык. Працаваў у Галоўным упраўленні па справах літаратуры і выдавецтваў пры Савеце Міністраў БССР. З 1950 года — рэдактар, з 1968-га — загадчык рэдакцыі перавыданняў і перакладаў выдавецтва «Беларусь». У 1972 — 1983 гг. — загадчык рэдакцыі перакладной літаратуры выдавецтва «Мастацкая літаратура». Пераклаў на беларускую мову творы А. Купрына «Алеся», Г. Маркава «Наказ», У. Цендракова «Вясеннія пярэваратні», Ч. Айтматава «Пасля казкі» («Белы параход»), раманы А. Рыбакова «Вадзіцелі», Дзін Лін «Сонца над ракой Сангань», Ф. М. Дастаеўскага «Белыя ночы», А. Ганчара «Бераг любові», А. Кешокава «Зламаная падкова», творы Л. М. Талстога, М. Садавяну, Лу Сіня... Леў Антонавіч шмат перакладаў і з беларускай мовы на рускую — раманы Р. Мурашкі «Салаўі святога Палікара», «Сын», М. Ткачова «Дыханне агню», М. Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі»...

*«Што датычыцца плана беларускага,* — тлумачыць Алесь Адамовіч, — *то я толькі магу паўтарыць, што ў Мінску раман выходзіў толькі ў 1964 г.*

*Са шчырай павагай Адамовіч».*

14 студзеня 1971 г. старшыня Камітэта дае распараджэнне разабрацца па сутнасці. Старшы рэдактар Камітэта Аляксей Гардзіцкі піша на гэты конт даведку (яна датавана 2 снежня). Вось змест той кароткай паперкі, напісанай таксама, як і ліст Алеся Адамовіча, ад рукі: *«Сапраўды, дылогія «Партызаны» А. Адамовіча выходзіць у выдавецтве «Художественная литература» не ў 1972 годзе, а ў 1971 годзе.*

*Разам з тым выдавецтва «Беларусь» лічыць, што выдаваць масавым тыражом раман два гады запар (у 1971 г. выдавецтвам «Художественная литература», і ў 1972 — «Беларусь») немэтазгодна.*

*Пры абмеркаванні плана выпуска 1972 года ў Дзяржвыдаце (відаць, маецца на ўвазе Дзяржвыдат СССР? —* **К. Л., В. С.***) вырашана раман А. Адамовіча «Партызаны» перанесці ў план выпуска 1973 года.*

*Пра гэта рашэнне мною паведамлена тав. Адамовічу А. М. па тэлефоне 2/ II — 1971 г. ...»*

Алесь Міхайлавіч усё ж меў рацыю, калі перажываў за лёс выдання рамана ўвогуле... Відавочна, што і далей пытанне маглі б завалацужыць. 16 жніўня 1971 г. пісьменнік ізноў звяртаецца да кіраўніка Дзяржкамдруку... *«Шаноўны Рыгор Васільевіч!*

*Хоць я і далёка, аж у Мазыры, але адчуваю, што раман мой і ў план 1973 г. не пападае. Хацеў бы ведаць, якую прычыну (у мінулым годзе — маскоўскае выданне) прыдумаюць на гэты раз.*

*Умяшайцеся, Рыгор Васільевіч!*

*З павагай — Адамовіч...»*

Гэтым разам Канавалаў рэзалюцыю наклаў канкрэтную: «... *Раман т. Адамовіча трэба ўключыць у план...»*

Абодва рамана «Партызанскай дылогіі» Алеся Адамовіча ўсё ж былі выдадзены ў Мінску менавіта ў 1973 годзе.

І «Вайна пад стрэхамі», і «Сыны сыходзяць у бой», як і іншыя творы Алеся Адамовіча, назаўсёды ўвайшлі ў скарбніцу беларускай нацыянальнай літаратуры, у яе залаты фонд. Шкада, што і амаль праз тры дзесяцігоддзі пасля смерці Алеся Міхайлавіча так і не прынята рашэнне аб выданні яго Поўнага збору твораў. Пры жыцці пісьменніка выйшаў чатырохтомнік яго мастацкіх і літаратуразнаўчых, літаратурна-крытычных, публіцыстычных твораў. Чаму б не сабраць разам усё зробленае вялікім вучоным і вялікім беларускім празаікам ды публіцыстам?

**Кастусь ЛЕШНІЦА,**
**Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.**

Кніжныя навінкі

# Вухуцік, Вятрыска і мышка Пік-Пік...




**У новым томе з бібліятэкі, якая прадэкларавана як сумесны літаратурны праект Саюза пісьменнікаў Беларусі і выдавецтва «Аверсэв», — творы пісьменнікаў, адрасаваныя маленькаму чытачу. На апошняй старонцы вокладкі зборніка «Чароўная скарбніца» так і пазначана: «Тры аўтары — Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Генадзь Аўласенка і Людміла Рублеўская — сустрэліся на старонках адной кнігі, каб прадоўжыць знаёмства са сваімі героямі: Вухуцікам, Ветрыкам з Вентылятара і мышкай Пік-Пік. У кожным з твораў — свае прыгоды, але яны аднолькава цікавыя і займальныя».**

«Вухуцік і яго таямніца» — так называецца раздзел, які прадстаўляе Кацярыну Хадасевіч-Лісавую і яе любімага героя, вандроўніка па Зямлі і іншых планетах. Самыя розныя адкрыцці чакаюць чытача, які збярэцца пазнаёміцца з Вухуцікам і вухуцянамі. Пісьменніца добра ведае псіхалогію самых маленькіх чытачоў, умее выбудаваць займальны, прыцягальны сюжэт. Кацярына Хадасевіч-Лісавая размаўляе з дзецьмі як з дарослымі, старонкі яе казачных аповедаў напоўнены святлом, цяплом і дабрынёй.

Генадзь Аўласенка знаёміць зусім з нечаканым персанажам — у зборніку змешчаны ўрывак з яго аповесці-казкі «Дзіўныя прыгоды маленькага Вятрыскі з Вентылятара». Каму спадабаецца такая сустрэча — шукайце іншыя кнігі пісьменніка: «Новыя прыгоды маленькага Вятрыскі з Вентылятара», «Вятрыска і пані Зіма», «Вятрыска і кароль пацукоў».

Людмілу Рублеўскую больш ведаюць як пісьменніцу для дарослага чытача, але піша яна і для дзяцей. У 2008 годзе ў выдавецтве «Літаратура і мастацтва» з'явілася на свет «Карона на дне віру, альбо Казкі з хутара Юстыны». А «Прыгоды мышкі Пік-Пік», якія ўпершыню ўбачылі свет у 2000 годзе, неаднойчы прыходзілі да чытача асобнай кнігай. У адным з інтэрв'ю пісьменніца сказала: «Казкі пра мышку Пік-Пік — гэта своеасаблівая сямейная казачная сага. Штовечар я распавядала для сваіх дзетак Веранікі і Максіма вясёлыя і гарэзныя гісторыі пра чароўную істоту, якая жыве ў іх кватэры. Дзеці не засыналі, пакуль не пачуюць пра чарговыя прыгоды мышкі. Героямі казак рабіліся ўсе сямейнікі, а таксама іх сябры...»

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# ПРЫВІТАННЕ З КРЫМА. «ЗЕЛЕНЯ» МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

**«Зеленя» — менавіта пад такой назвай, блізкай кожнаму багдановічазнаўцу, выйшла новая кніга знакамітага паэта. Убачыла свет яна сёлета, у Сімферопалі, у выдавецтве «Медыяцэнтр імя Ісмаіла Гаспрынскага» як сумесны праект РНКА «Беларусы Крыма», РНКА «Украінская абшчына Крыма» і ВГА «Рускі дом».**

За аснову кнігі ўзятыя вершы з рукапіснага сшытка аўтаперакладаў Максіма Багдановіча «Зеленя», які быў падрыхтаваны спецыяльна для яго стрыечнай сястры — Нюты Гапановіч. З нейкай прычыны яна адмовілася знаёміцца з беларускімі вершамі Максіма, але паколькі Багдановіч бачыў, што яна шчыра цікавілася яго творчасцю, паэт вырашыў спецыяльна для Нюты перастварыць творы на рускай мове. Цяпер гэты рукапіс захоўваецца ў фондах Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.

Большая частка вядомых рускамоўных вершаў Максіма Адамавіча — якраз аўтапераклады. Арыгінальныя тэксты, напісаныя па-руску, былі хутчэй выключэннем з правіла. Такія творы прадстаўлены ў кнізе асобным раздзелам. Больш за тое, выдаўцы ўзялі на сябе клопат і пераклалі вершы Максіма Багдановіча на ўкраінскую мову, змясцілі іх паралельна — білінгвай. Пераклад з рускай на ўкраінскую зрабіла Л. А. Салдаткіна, за што ёй асаблівая ўдзячнасць. Бо няхай нашыя мовы пайшлі «з аднаго кораня», як казаў Максім, але мы розныя, і добра, што ёсць магчымасць знаёміцца з вершамі на роднай мове.

Завяршае кнігу разгорнуты артыкул Андрэя Герашчанкі, які прадставіў у ім сваё бачанне біяграфіі Максіма Багдановіча і ролю пісьменніка ў міжкультурных зносінах славянскіх народаў. Выхад кнігі «Зеленя» можна лічыць сапраўднай падзеяй, бо вершы Багдановіча апошнім часам рэдка выходзілі на рускай мове. А на дзяржаўным узроўні — увогуле ў 1971-м да 80-годдзя паэта.






Хочацца спадзявацца, што ініцыятыва беларусаў Крыма будзе заўважаная, і рускамоўны, і ўкраінскамоўны чытач адкрыюць для сябе прыгажосць паэзіі Максіма Багдановіча. Мы ўпэўнены, што кніга падштурхне да новых выдавецкіх праектаў і дапаможа далучыцца да яго паэзіі іншым народам паўвострава. Магчыма, знойдзе падтрымку і ідэя стварэння музейнай экспазіцыі, прысвечанай нашаму герою, якога лёс назаўсёды звязаў з Ялтай, месцам апошняга спачыну Багдановіча. Са свайго боку супрацоўнікі музея гатовыя аказаць неабходную метадычную дапамогу, а таксама прадставіць электронныя копіі матэрыялаў, якія змогуць распавесці пра паэта і яго апошнія дні «у краіне светлай... ля сіняй бухты».

Творчасць Максіма Багдановіча вучыць нас заставацца людзьмі і заклікае разам ляцець да зор, дык чаму б не прыслухацца да самага маладога класіка беларускай літаратуры.

**Міхаіл БАРАНОЎСКІ,**
**загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.**

# «СТОЛЬКІ ДУМАК ЗЛАЖЫЎ АБ ЁЙ ВАЖНЫХ, ТАЁМНЫХ...»

## Штрыхі да партрэта Паўліны Мядзёлкі

*«Гэткім шчырым каханнем яе атуліў,*
*З гэткай ласкай глядзеў у яе сумныя вочы, —*
*Як і сонца не туліць расквечаных ніў,*
*Як і зоры людзям не ўглядаюцца ўночы!..*
*Столькі песень над песнямі ёй я напеў,*
*Столькі думак злажыў аб ёй важных, таёмных, —*
*Як і бор гэтак з ветрам шумець не шумеў,*
*Як і век гэткіх дум не злажыў для патомных!*
*...Утварыў з яе шчасце з-пад шчасцяў сваё —*
*Чарадзейную княжну з аповесці дзіўнай,*
*І пад ногі ёй кінуў жыццё сваё ўсё...*
*. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .*
*А яна?.. А яна была толькі... дзяўчына!..»*

Гэты горкі верш Янка Купала напісаў пра сваё палкае і нешчаслівае каханне — прыгажуню Паўліну Мядзёлку, першую выканаўцу ролі Паўлінкі. Так яна найперш і ўвайшла ў гісторыю — пакутлівай Музай вялікага нацыянальнага паэта.

Прайшло 130 гадоў ад таго дня, як у Будславе, у сям'і настройшчыка раяляў і арганаў, нарадзілася чароўная дзяўчынка Паўлінка. Давайце ўспомнім незвычайныя факты з яе біяграфіі, у чым дапаможа і яе «легальная» аўтабіяграфія, выдадзены ў 1974 годзе зборнік «Сцежкамі жыцця», і перавыдадзены поўны варыянт, і тыя запісы, якія яна не прызначала да друку.

### СА СЛОВАМІ МАЦЕЯ БУРАЧКА

Першае публічнае выступленне Паўлінкі адбылося ў Глыбокім, дзе тады жыла сям'я. Дзяўчынка марыла вучыцца, і ёй дапамагла мясцовая жыхарка, панна Юлія — але вучыла на польскай мове і ў духу польскага патрыятызму. А потым у рукі Паўлінцы трапіла газета «Наша доля» і «Дудка беларуская» Мацея Бурачка. Асабліва моцна запала ў душу прадмова да «Дудкі беларускай»: *«Я сам калісь думаў, што мова наша — «мужыцкая» мова і толькі таго... пераканаўся, што мова наша ёсць такая ж людская і панская, як і французская, або нямецкая, або іншая якая».*

Напярэдадні 1907 года панна Юлія прапанавала Паўлінцы выступіць з дэкламацыяй вершаў на навагодняй ёлцы, прачытаць Адама Міцкевіча. А бацька Паўлінкі — агучыць верш Мацея Бурачка толькі нікога не гаварыць загадзя настаўніцы.

І вось пазбіраліся жыхары Глыбокага на навагоднюю ёлку, дзівяцца, як прыгожа ўсё ўбрана, як пекна выступаюць дзеткі. Надышла чарга Паўлінкі... І яна чытае верш Мацея Бурачка, ён жа Францішак Багушэвіч.

*«У публіцы падняўся шум, гоман:*

*— Па-просту гаворыць! Слухайце, слухайце, папросту, па-нашаму гаворыць!*

*— Цішэй вы там!*

*— Не пхніцеся! Дайце паслухаць!*

*Усе, хто стаяў на вуліцы, пачуўшы, што гавораць вершы на простай, тутэйшай мове, рынуліся ў залу і так стоўпіліся, што бліжэйшым прыйшлося стрымліваць напор.*

*Аднекуль з'явіўся стол, мяне паставілі на яго і сказалі: «Гавары зноў!»*

У польскага панства, між тым, быў шок — яны сабраліся гуртам, шапталіся, потым параілі дзёрскай дзяўчынцы больш ніколі не выбіраць творы для выступлення, не параіўшыся з паннай Юліяй.

*«Я адчула, што ім не да спадобы прыйшліся вершы Мацея Бурачка. Але ўсё ж маё першае публічнае выступленне было на роднай мове».*



*— Бо я вас бачыў перш за сталом сацыялістаў, пасля сярод хрысціянскіх дэмакратаў, а цяпер за сталом эндэкаў. Ці вы так часта мяняеце свае погляды, ці наогул беспрынцыповы чалавек?*

*— Я мяняю не свае погляды, а стол, за якім ёсць вольнае месца, адказваю ўжо злосна».*

На абурэнне Паўлінкі хлопец патлумачыў, што кожная палітычная групоўка студэнтаў мае тут свой стол і ніхто за чужы не сядае.

Прыйшлося Паўлінцы даядаць свой суп стоячы.



А Купала выбраў Уладку....

### ПЕРАБЕЖКІ З МІСАЙ У РУКАХ

Увосень 1912 года Паўлінка паехала ў Пецярбург, на Вышэйшыя камерцыйныя курсы. Грошай было няшмат, і ёй параілі харчавацца ў студэнцкай сталоўцы, арганізаванай студэнцкай касай узаемадапамогі. Там было танна, і можна было падтрымліваць патрэбныя сувязі. Але Паўлінка не чакала, які ў той сталоўцы ў яе атрымаецца канфуз.

*«У першыя дні я са сваёй міскай садзілася за стол, за якім бачыла сваіх сяброў з нелегальнага гуртка ў Вільні ці студэнтаў-беларусаў. Але аднаго разу, не пабачыўшы нікога з іх, я села на першае вольнае месца, якое трапілася на вока. Праз хвіліну падыходзіць да мяне нейкі хлопец і кажа:*

*— Чаму вы селі за гэты стол?*

*— Як гэта — чаму? — здзіўлена адказваю. — Вольнае месца, я і села.*

*— Вы, напэўна, я заўважыў, — не належыце да нарадовай дэмакратыі?*

*— Не. А чаму вас гэта цікавіць? — падазрона пытаю.*

Нагадаю, што менавіта там, у Санкт-Пецярбургу, Паўлінка стала легендай, калі сыграла галоўную ролю ў прэм'еры п'есы Янкі Купалы «Паўлінка» на сцэне рабочага клуба «Пальма».

### ПРЫЎЛАШЧАНЫ ВЕРШ

Паўліна Мядзёлка моцна перажывала, як выдадуць пакрэслілі яе мемуары, хоць сама разумела: не ўсё магло прагучаць у савецкія часы. У Беларускім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва захоўваецца яе сшытак, на першай старонцы якога значыцца: *«Беглыя нататкі для памяці (Факты, якія ніколі не могуць і не павінны быць апублікаваны)». «А памяць затухае... Калісь вострая памяць катастрафічна затухае. І не дзіва — праз 3 месяцы мне стукне 75 гадоў. Трэба спяшацца, каб хоць паасобныя ўрыўкі, што ўсплываюць на памяць, запісаць».*

Зразумела, мы павінны ўлічваць, што аўтар патаемных запісаў думала і пра тое, як будзе выглядаць для нашчадкаў, таму не ўсё ў іх варта прымаць на веру.

2 мая 1970 г. Паўліна Мядзёлка занатоўвае чарговы ўспамін:

*«Быў гэта быццам мілы сон...» Толькі што пачула гэтыя словы па радыё ў кампазіцыі з твораў Я.Купалы «Яна і ён». І ўспомнілася тое, пра што нікому сказаць, ні ў сваіх «Сцежках жыцця», напісаць не магу, не хачу. А вось сама сабе... Не магу ўстрымацца успамінаў.*

*...Вільня. 1914 год. Седзячы ўдваіх з Янкам за столікам цукерні «Зялёнага Штраля», дзе кожны вечар сустракаліся нашаніўцы, акторы, мастакі, Янка сказаў:*

*— Паўлінка, давай мы з табой пажэнімся, раздзялі ты са мною долю і нядолю.*

*Хоць гэта было вымаўлена зусім сур'ёзна, але я не паверыла ў гэту сур'ёзнасць, бо ні разу з яго боку не чула слоў кахання. Нават тады, калі ў Пецярбурзе ў 1913 г. палез да мяне цалавацца пасля няўдалай сцэны на рэпетыцыі «Паўлінкі» («Ты прыйшоў вучыць мяне, як цалавацца з Якімам? Пайшоў прэч! Без тваёй навукі абыдуся!», — так тады адказала яму).*

*А ў той вечар у Штраля —*

*— Яначка, я цябе люблю, як нашага паэта, як харошага сябра і не больш. А гэтага мала, каб быць тваёй жонкай».*

Да таго ж патлумачыла, што яе сэрцам уладарыць іншы.

На наступны вечар Янка Купала прыйшоў у тую ж цукерню маўклівы, змрочны, прызнаўся, што ўсю ноч не спаў і напісаў верш, які і даў Паўлінцы прачытаць:

*«Быў гэта толькі сумны сон*
*Душы расплаканай маёй,*
*Што сярод буднік цяжкіх дзён*
*Я свята меў, глядзеў ясней...*
*Быў гэта толькі сумны сон,*
*Што развяду я з ёй бяду...»*

Паўліна піша, што пазней часта спявала гэтыя словы на матыў Глінкі «Не



искушай меня без нужды». Вядома, яе самалюбства цешыла, што яе адмова гэтак узрушыла паэта і вылілася ў цудоўны верш. І да канца жыцця яе вярэдзіла, што Купала ўрэшце ажаніўся з яе сяброўкай, Уладзіславай Станкевіч, якую Паўліна відавочна лічыла куды менш прывабнай за сябе. У патаемных нататках вельмі шмат прысвечана абгрунтаванню думкі, што Купала Уладзіславу не кахаў, жыццё з ёю было нешчаслівым, увогуле з Паўлінкай яму было б куды шчасней. Часам яна нават сцвярджала ў гутарках, што таксама кахала Купалу. Але хацела «праверыць пачуцці».

*«І якое ж было маё здзіўленне, калі Владка ўжо ў гады вайны ў Маскве паказала мне выразку з «Нашай нівы» з гэтым вершам з надрукаваным прысвячэннем Уладзіславе Станкевічанцы».*



Зразумела, Мядзёлку гэта закранула, тым болей давесці свае правы на верш народнага паэта, якога ўжо не было ў жывых, — як? Яе ўзрадавала, што ў поўным зборы твораў Янкі Купалы верш быў надрукаваны ўвогуле без прысвячэння. Яна нават удакладніла ў вучонага сакратара музея Янкі Купалы, і той патлумачыў, што прысвячэння не ставілі, бо ў рукапісе, які захаваўся ў архіве, яго няма. Мядзёлка зрабіла выснову, што прысвячэнне ў «Нашай ніве» з'явілася пасля таго, як Уладзіслава стала жонкай Купалы — натуральна, паэт хацеў зрабіць падарунак маладой жонцы.

«Калі так, дык якая ж сувязь гэтага верша з Владкай?» — крыўдуе Паўліна Мядзёлка. Але зрабіць, каб верш друкаваўся з прысвячэннем ёй самой, было не ў яе ўладзе.

### МІСТЫЧНЫ ПОКЛІЧ ПРАЗ ЗАВІРУХУ

Шмат давялося перажыць Паўлінцы... Прайшла і польскія турмы, і сталінскія... Заўсёды заставалася беларускай патрыёткай — паводле слоў Уладзіміра Калесніка, у Гародні польская клерыкальная газета назвала Мядзёлку Мяцёлкай, якая вымятае польскі дух і насаджвае беларускі. Апісваючы, як яны з мужам чакалі расстрэлу ў Мінску, акупаваным белапольскімі войскамі, яна перадае свае думкі: *«Так, жыццё я складаю на алтары Бацькаўшчыны. Ах, вянкоў ніякіх не патрэбна! Жыццём і смерцю сваёй я хацела б збудзіць да чыну тых, якія дрэмлюць яшчэ, хацела б вочы іх звярнуць да сонца праўды, у душах іх распаліць агонь гарачага кахання да Бацькаўшчыны...»* Вось калі яе арыштавалі ў 1930-м, ужо ў савецкай турме, рамантычны пафас знік. Пасля дзесяці дзён канвеернага допыту падпісала ўсё... Высылка ў Казань, дзе працавала, паводле некаторых крыніц, у Наркамасвеце. Потым нейкі час настаўнічала ў Маскве. Потым вярнулася на Беларусь, у родны Будслаў. Таксама настаўнічала.

Неадназначнымі выглядаюць і яе адносіны з сям'ёй Купалы — а яна была частай госцяй у іх доме па сваім прыездзе ў БССР. Колішні бялявы хлопец з несур'ёзнымі размовамі цяпер быў гонарам народа, жывым класікам, уганараваным усемагчымымі прывілеямі — але ж і знаходзіўся пад увесьчасным наглядам.

Уладзіслава Францаўна заўсёды ветла прымала сяброўку, а ў апошнія гады часта нагадвала, што яны амаль апошнія засталіся са свайго былога кола і трэба трымацца адна адной.

*«25 лютага 1960 г. вечарам я за сваім сталом — чытала ўголас маме якуюсь кнігу. А ў галаве мільгала думка, што мне сёння трэба выехаць у Менск. Чаго? Каму я там патрэбна? Праганяю гэту думку і прадаўжаю чытаць. І зноў: як жа мне дабрацца да станцыі? На дварэ сільная вея, гурбы снегу... Ну, што за ліха! Нашто мне здаўся той Менск, чытаю далей. А што мне сядзець? Што з сабой узяць? І да таго гэтыя назойлівыя думкі надакучылі, што не змагла далей чытаць. Каля 10 гадзін вечара заходзіць суседка, у якой дома ёсць тэлефон.*

*— Паўліна Вікенцьеўна, званілі з пошты, прыйшла вам тэлеграма з Мінска.*

*— Як жа я пайду на пошту ў такую завіруху? А не перадалі тэксту тэлеграмы?*

*— Памерла Брані... Брані... вось забылася...*

*— Уладыслава Францаўна? — ускрычала я.*

*— Ага!*

*Дык вось чаму мне трэба зараз жа сабірацца ў Менск!»*

Паўліна Мядзёлка паехала ў Мінск і прысутнічала на пахаванні Уладкі. Гэтак жа, як гадамі раней на пахаванні Янкі Купалы. Калі ён загінуў, яна якраз была ў Маскве. Менавіта нататкі Мядзёлкі аб тых падзеях у яе патаемных запісах сталі важнай крыніцай для многіх, хто спрабаваў разгадаць таямніцу гібелі паэта.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# «У гародзе — памідоры, а ў садзе — вішня...»

## Фестывалі ў гонар пладоў зямлі




***Мы ўсе ведаем, што такое «Дажынкі» — свята заканчэння збору ўраджаю на палях, якое спаконвек адзначалі беларусы...***

***Але ж не толькі зерне багацеем мы пасля лета. У кожным рэгіёне, у кожным мястэчку і вёсцы ёсць свае ўлюбёныя плады і ягады, лепшых, смачнейшых за якія — месцічы вам абавязкова гэта давядуць — нідзе няма. І ўсё болей узнікае вясёлых свят, прысвечаных якой-небудзь пладова-ягаднай культуры... У гэтым беларусы не самотныя — згадаць хаця б свята лушчэння фасолі ў Брэтані, фестываль рэпы ў швейцарскім Рыхтэрсвілі ці свята цыбулі ў расійскім Луху. Але кожнае такое беларускае свята, маленькае, вялікае, мае свой каларыт і гісторыю. Давайце згадаем.***

### ГЛЫБОЦКАЯ ВІШНЯ

*«У вішнёвым, у маёвым*
*Белым кіпені — зямля.*
*Паўтараюцца нанова*
*Кольцы часу і камля»*, — пісала Яўгенія Янішчыц. А Якуб Колас у «Новай зямлі» так падае малюнак лесніковай пасады: «Па-над парканам пышным валам стаяў вішняк густы, прыўдалы».

А колькі песняў на Беларусі пра вішню...

З'явілася ў нас і свая вішнёвая сталіца — Глыбокае. Там і вуліца носіць назву Вішнёвая, і помнік вішні пастаўлены, і ўчыняюць аўкцыён па продажы вішнёвага пірага, і мясцовы камбінат згушчонку выпусціў са смакам вішні! А калі ў ліпені, з усіх куточкаў, з'язджаюцца сюды на Вішнёвы фестываль, выбіраюць Вішнёвую каралеву — як у вершы той жа Янішчыц:

*«Вішня ў квеце,*
*цененькая дрэва*
*да смугі — адкрытае вясне.*
*Жэўжыкі гукаюць: «Каралева!»*
*Каралева? А чаму ж і не!»*

Яшчэ шмат стагоддзяў таму, калі мястэчка належала Радзівілам, квітнелі тут сады... Спелі вішні пры базыльянскім і кармеліцкім кляштары... Ну а ў пачатку XX стагоддзя мясцовы аграном-селекцыянер Баляслаў Лапыр, аматар беларускага фальклору, які размаўляў на беларускай мове і іграў у самадзейных беларускіх тэатрах, вывеў адмысловы сорт вішні, які назваў — нізавошта не здагадаецеся — «Вішня кіслая». Сорт, які і сёння вельмі паважаюць садаводы за зімаўстойлівасць ды пладаноснасць. А яшчэ скрыжаваў вішню з чарэшняй — вось у гэтай сакавітай ягадзіне слодычы хапае. Хоць назва не афіцыйная, сарты глыбоцкія ў народзе завуць «лапыровымі».

Ушаноўваюць глыбоцкую вішню ўздзельнікі фэсту вось ужо дзесяць гадоў у ліпені. Але вішня суправаджае жыццё мястэчка круглы год — усе мясцовыя вяселлі абавязкова кіруюцца да скульптурнай кампазіцыі «Вішанька», каб пацерці ягаду — для нараджэння дзіцяці, лісцік — каб у сям'і хапала грошай, і галінку — на доўгае жыццё.

### ШАРКАЎШЧЫНСКІЯ ЯБЛЫКІ

*«Неяк на багатым нясвіжскім кірмашы маладжавы вясёлы мужчына так падахвочваў мяне браць яго яблыкі:*

*— Яны ж у мяне, таварыш, не глядзяць, а смяюцца!*

*І праўда, яблыкі былі вялікія, румяныя, адно ў адно».*

Так пісаў Янка Брыль у навеле «Жывое слова».

Не глядзяць, а смяюцца яблыкі і на Шаркаўшчыне, дзе адбываецца «Яблычны фэст». Святкуюць яго не толькі ў самой Шаркаўшчыне, а найперш у суседняй вёсцы Алашкі. Тут жыў знакаміты садавод-селекцыянер Іван Сікора, заслужаны аграном БССР, тут на базе яго саду адкрыўся Паўночны апорны пункт Беларускага навукова-даследчага інстытута бульбаводства, пладаводства і агародніцтва. У садзе прайшлі апрабаванне звыш шасці соцень сартоў яблынь, у тым ліку гібрыд № 1377, які назвалі «яблыкамі XXI стагоддзя», а пасля смерці Сікоры сорт атрымаў назву «Памяць Сікоры». Тыя, хто прыязджае сюды, могуць пакаштаваць і гэты гатунак, і іншыя — і адчуць тое, што і юны княжыч Алесь Загорскі ў «Каласах пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча: «Яблыка было сцюдзёнае, у халодных дажджавых кроплях, і ён адкусіў з хрумстам і праглынуў, як самое здароўе праглынуў».

Прымяркоўваюць свята звычайна да Яблычнага Спасу.



### ШКЛОЎСКІЯ АГУРКІ

*«Сёння і вечна! —*
*і мы са шчаслівых.*
*Бульбу пастаўлю, гуркі пасалю.*
*Я і сама не люблю*
*шкадаўлівых,—*
*Болей суровых і гордых люблю»*, — апісвала Яўгенія Янішчыц традыцыйны беларускі стол, якім сустракаюць нечаканага госця. У «Трывожным шчасці» Івана Шамякіна героі таксама сілкуюцца падобна: «На снеданне гаспадыня падала халодную бульбу, гуркі і міску сыракавашы». Рыгор Барадулін, калі ўспамінае першага верасня, марыць пусціцца басаножу ў падарожжа, «У край, дзе раніцай салодкі сон, // Дзе ў сумцы агурок, аловак, сцёрка».

Ну як жа ісці ў школу, у лес, на пасьбу ці касьбу без агурка ў сумцы ці кішэні! Ёсць на Беларусі і свята ў гонар гэтай звыклай і неабходнай гародніны — ладзяць яго на Шклоўшчыне. І невыпадкова: як пісалі ў XVIII стагоддзі, «Ва градзе Шклове па дабрыні зямлі і па прыемнасці паветра луку, часнаку, а найперш агуркоў забагата». Дзень агурка праходзіць у жніўні, весела, з дэгустацыямі, спаборніцтвамі, песнямі, скокамі, гульнямі... Сярод традыцый — наведванне помніка Агурку, які ў 2007 годзе з'явіўся ў Шклове. Дакладней, называецца гэтае дзіўнае стварэнне «Агуродзец», і мясцовыя лічаць, што, каб урадзілі ў наступным сезоне агуркі, трэба ўкінуць у кошык скульптуры семачкі.



### МЁРСКІЯ ЖУРАВІНЫ

*«Ах, на шчасце,*
*яшчэ ды не ўсохла балота,*
*А за ім векавее зажураны гай.*
*Покуль дождж не пайшоў,*
*не апала лістота,*
*Запрашаю цябе ў журавінавы рай»*, — настальгіравала Яўгенія Янішчыц. А яшчэ журавіны ў яе атаясамліваюцца з Мележам: *«Ды ў час, калі шукае слова — слова, // Знябыўшы тлусты тлум і мітусню, // Агеньчык цыгарэты Куляшова І журавіны Мележа — прысню»*. Відаць, і аўтар «Людзей на балоце» дужа любіў гэтыя яркія ягады...

Але журавінамі славіцца не толькі Палессе, адкуль Янішчыц і Мележ... На Віцебшчыне штогод у канцы верасня адбываецца экалагічны фестываль «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю». Тут знаходзіцца легендарнае балота Ельня — адно з самых вялікіх у Еўропе. Увосень тут збіраюцца ад 5 да 7 тысяч шэрых жураўлёў, якія ляцяць на зімоўку. Так што аб'екты свята — і жураўлі, і журавіны. Аматары гастранамічнага турызму могуць пакаштаваць самыя незвычайныя стравы з журавін, ну і набыць самі ягады, якія так любілі і нашы продкі. Як апісваў Уладзімір Караткевіч беларускі рынак шаснаццатага стагоддзя ў «Сівой легендзе»: «Гамарня, носяць на каромыслах цэбры з яблыкамі, мяшчане журавіны марожаныя з рук ірвуць — на пахмелку».

### ІЎЕЎСКІ ПАМІДОР

«У гародзе — памідоры, а ў садзе — вішня. Хацеў мілы падмануць, нічога не выйшла», — спявалі ў беларускіх вёсках. *«Фіранкі на вокнах, у хляве вішчаць парасяты, на гонтавым даху грэюцца на сонцы пузатыя жоўтыя гарбузы і апетытныя чырвоныя памідоры»*, — герой эпапеі Шамякіна «Трывожнае шчасце» гэтай карціны трохі спалохаўся: занадта заможная хата! Ці пусцяць пераначаваць?

Гэта сёння нікога не здзівіш памідорамі ў гародзе... А калі ў XVIII стагоддзі іх сталі вырошчваць на Беларусі, напеклаваліся: расліна цеплалюбная, нашы ранішнія туманы не зносіць. Але ў Іўі памідоры заўсёды былі цудоўныя! Таму і святкуецца тут фэст «Іўеўскі памідор».

Старажытнае мястэчка вядомае з пачатку XV стагоддзя, у канцы якога князь Вітаўт і пасяліў тут татараў, прывезеных ім з Прыазоўя. Татарскія воі дапамагалі яму ў Грунвальдскай бітве, за што князь падарыў ім урочышча Мураўшчызна каля Іўеўскага замка. Нашчадкі тых татар жывуць у Іўі па сёння. А татары спаконвек славіліся як добрыя агароднікі, вось Іўеўская гародніна і дасюль мае попыт. Кажуць, ні ў адным іншым беларускім мястэчку няма столькі цяпліц. Свята адбываецца на пачатку верасня: конкурсы, канцэрты, кулінарныя батлы. Нават бойка памідорамі «Іўе дэ-таматэйра», а яшчэ конкурсы па плаванні на самых дзіўных прыстасаваннях «Плаў-Тамат» і на хутчэйшае паяданне тых жа памідораў.

### УЗДЗЕНСКАЯ БУЛЬБА

*«А потым бабка надумалася пачаставаць яго асаблівая вячэраю. Яна наскрэбла чыгунчык бульбы. Калі бульба зварылася, бабка патаўкла яе, дадала пшанічнай мукі ды ўбіла пару яечак. З кашы яна рабіла піражкі і падсмажвала іх на скавародцы. Такіх піражкоў настаўніку ніколі не даводзілася каштаваць, ён еў з ахвотаю і хваліў кухарскія здольнасці бабкі Параскі. Бабка ўся цвіла ад задавалення»*, — вось так яскрава апісвае Якуб Колас пачастунак свайго героя і альтэр эга Андрэя Лабановіча ў эпапеі «На ростанях», зразумела, скарыстаўшы ўласныя ўспаміны.

Ну як абысціся без самай галоўнай гародніны! Яе пякуць у вогнішчы героі «Каласоў пад сярпом тваім», яе згадвае як сімвал мірнага жыцця герой Шамякіна ў аўтабіяграфічнай эпапеі «Трывожнае шчасце» пасля вяртання з фронту: *«Што нам трэба, Сашок? Хіба тое, што я вярнуўся жывы і не вельмі пакалечаны, і ты жывая, і Ленка здаровенькая расце — не найвялікшае шчасце? Колькі людзей палягло! А мы жывыя. І любоў наша жывая. Нічога нам больш не трэба. Хіба кавалак хлеба ды чыгунок вось гэтай бульбы... Не, мы не станем яе абіраць. Мы зварым яе ў «мундзірах». Больш ганарова для бульбы сказаць: зварым у «шынялях». Салдацкая страва! А пасля, Лянок, аблупім «шынелькі», бульбачка жоўценькая будзе, апетытная...»*

Вырошчваюць бульбу на Беларусі з васямнаццатага стагоддзя. Праўда, садзілі яе тады ў каралеўскіх эканоміях нямецкія каланісты, сяляне ж насцярожана прыгледзеліся. Але ў дзевятнаццатым стагоддзі ўзніклі нават беларускія сарты бульбы — на выставе ў Горы-Горацкім земляробчым інстытуце ў 1853 г. экспанавалася 28 сартоў з батанічнага саду інстытута, а народ заспяваў: «Гарні, гарні бульбу з печы, у торбачку ды за плечы». І сёння на Беларусі шмат фэстаў, прысвечаных бульбе. Сёлета «Бульба-фэст» адбыўся ў аграгарадку Дзешчанка на Уздзеншчыне. Тут знаходзіўся цэнтр бульбаводства, адсюль развозілася насенне бульбы на ўсёй краіне... Нават помнік бульбе ёсць! Ладзяць фестываль бульбы ў Капылі, там з яе прадстаўлялі не толькі стравы, але і мастацкія творы — пейзажы і жанравыя карцінкі. Абласны фестываль «Картошка-бульба-Potatoes» правялі ў Віцебску падчас II Гульняў краін СНД, дзе прадставілі паўтысячы страў з бульбы.

Карацей, сачыце за культурным жыццём рэгіёнаў — і трапіце на штосьці незвычайнае! І смачнае, вядома.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Поддон 800*1200 П4, 20 шт.; Поддон трансп.1200*1000*120, 5 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 1 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 11 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 10 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 9 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 10 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 9 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 3 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 25 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 13 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 2 шт.; Поддон 2П04, 2 шт.; Поддон 2П04, 7 шт.; Поддоны ПКП-78ц1, 14 шт.; Поддоны ПКП-78ц1, 8 шт. | 262,12 | 26,21 | 13,11 |
